Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 86 (6363) | 15 красавіка 1939 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

СЕННЯ У НУМАРЫ:

Уручэнне ордэнаў і медалей Саюза ССР перадавікам сельскай гаспадаркі Беларускай ССР.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб узнагароджанні пачотнай граматай Вярхоўнага Совета БССР Магілеўскай музыкальнай школы імені Рымскага-Корсакава ў сувязі з 20-годдзем школы.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб узнагароджанні работнікаў Магілеўскай музыкальнай школы імені Рымскага-Корсакава ў сувязі з 20-годдзем школы.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ:

У дапамогу прапагандысту. Ф. Кошэлеў — Аб комуністычным выхаванні працоўных.

П. Трэцяноў — Умацоўваем калгасныя партыйныя арганізацыі.

А. Осіпаў — Байцы і камандзіры вывучаюць рашэнні з'езда.

Да 80-годдзя з дня нараджэння Шолам-Алейхема.

А. Гурштэйн — Шолам-Алейхем.

Змітрок Бядуля — Бессмяротны Шолам-Алейхем.

Сара Каган — Ён любіў свой народ.

А. Цэйтлін — Любімы пісьменнік.

ЗА РУБЯЖОМ:

Дэкларацыя французскага ўрада.

Выступленне Чэмберлена ў англійскім парламенце.

Прадстаячыя манеўры германскага флота.

Канцэнтрацыя германскіх войск на польскай граніцы.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі.

Італьянскі кароль прыняў албанскую карону.

СВЕДЧАННЕ ВЯЛІКАЙ ДРУЖБЫ

Непарушнай сталінскай дружбай з'еднаны народы Совецкага Саюза. У нашай краіне няма нацыянальнай няроўнасці. Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя, знішчыўшы капіталістычны лад, з яго лютай эксплуатацыяй чалавека чалавекам, з яго жабрацкім і бесправсветным жыццём працоўных, знішчыла назаўсёды і нацыянальны прыгнёт. Яна ажыццявіла справедлівыя мары абрабаваных і забітых народаў былой царскай Расіі аб соцыяльным і нацыянальным вызваленні, аб светлым і радасным жыцці.

Ленінска-сталінская нацыянальная палітыка прабудзіла да жыцця скаваныя расай невычарпальныя творчыя сілы народаў. Яна забяспечыла кожнаму з іх не толькі небывалы матэрыяльна-эканамічны ўздым, але і небывалы росквіт новай культуры — нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу. Гэтая новая культура ўвабрала ў сябе ўсё лепшае, што створана чалавецтвам на працягу яго шматвяковай гісторыі, усё тое, што рухае чалавецтва ўперад. Гэтая культура з'яўляецца самай перадавой, самай прагрэсіўнай культурай на зямным шары.

Агульнасць інтарэсаў і імкненняў совецкіх народаў, іх непарыўная сувязь шчыльна аднае і іх культуры. Усё, што прадстаўляе здабытак аднаго народа, кожнае яго новае дасягненне становіцца здабыткам і дасягненнем усіх народаў нашай краіны. Культурная спадчына совецкіх народаў, іх вусная творчасць, іх літаратура і мастацтва складаюць багацейшую скарбніцу нашай культуры. З аднолькавай павагаю мы адносімся да гістарычных помнікаў народаў, з аднолькавай урачыстасцю ушаноўваем юбілейныя даты іх лепшых сыноў, якія аддалі свае таленты і здольнасці, сваё жыццё барацьбе за шчаслівую будучыню чалавецтва.

Зусім нядаўна грамадскасць усёй нашай краіны ўрачыста адзначала 125-годдзе з дня нараджэння вялікага сына украінскага народа, паэта-рэволюцыянера Тараса Шэўчэнка. Святкаванне гэтага юбілею з'явілася новым доказам таварыства ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, яркім сведчаннем непахіснай дружбы народаў СССР. Сёння з такой-жа ўрачыстасцю народы СССР адзначаюць 80-годдзе з дня нараджэння вялікага класіка яўрэйскай літаратуры Шолам-Алейхема.

У сілу шматлікіх гістарычных акалічнасцей яўрэйскі народ спрадвеку быў рассеян па ўсіх краінах свету. У былой царскай Расіі ён цярпеў асабліва моцны нацыянальны ўціск. Толькі яўрэйская буйная буржуазія карысталася правамі грамадзянства. Працоўныя-ж яўрэйскія масы падвяргаліся нечуванаму прыгнёту і здзекам. Яўрэям забаранялася законам сяліцца па свайму выбару. Яны былі пазбаўлены права займацца земляробствам. Час-ад-часу, натхнёныя царскім урадам і патураемыя ім, чорнасоценныя падонкі грамадства наладжвалі жудасныя яўрэйскія пагромы, ад якіх цярпела перш-за ўсё яўрэйскае працоўнае насельніцтва.

Працоўныя яўрэі, як і працоўныя іншых прыгнечаных нацыянальнасцей царскай Расіі, пераносілі ўсе жахі капіталістычнага рабства.

Тое, што для нас стала ўжо змрочнай вданню мінулага і адышло ў небыццё, адбываецца сёння яшчэ з большай жудасцю там, за мяжой, дзе пануе крывавы фашызм. У фашысцкай Германіі, як і ў іншых фашысцкіх краінах, яўрэі пазбаўлены элементарных чалавечых праў. Яўрэйскія пагромы, якія наладжваюцца раз'юшанымі фашысцкімі бандамі, даўно пераўзышлі па сваёй жудасці пагромы ў царскай Расіі. Яны выклікаюць гнеўны пратэст усяго прагрэсіўнага чалавецтва.

Жадаючы адцягнуць увагу народных мас ад рэволюцыйнай барацьбы, фашызм імкнецца распаліць нацыянальную рознь. Усімі мерамі знішчаючы здабыткі культуры яўрэйскага народа, душачы яўрэйскі працоўны люд, ён адначасова знішчае здабыткі агульначалавечай культуры, душыць працоўных усіх нацыянальнасцей. Для ўсіх працоўных ён нясе соцыяльнае і нацыянальнае заняволенне, пэмру, галечу і голад. Чорная здань фашызма азначае сабой зварот да самых змрочных часоў гісторыі, да жудаснага сярэднявякоўя.

Шолам-Алейхем быў выказвальнікам дум і спадзяванняў прыгнечанага царызмам яўрэйскага народа. У змрочныя і цяжкія годы ён сваім пудоўным пяром мастака ярка і красачна адлюстроўваў тыповае і характэрнае, уваплашчаў тое, аб чым марыў абязздолены і прыніжаны працоўны. Сіла Шолам-Алейхема іменна ў тым, што карэннямі ўсёй сваёй творчасці ён быў звязан з народам, з яго інтарэсамі, радасцямі і перажываннямі.

З вялікай прастатой і яснасцю, з непаддзельным юмарам, які ён чэрпаў з багацейшай народнай творчасці, Шолам-Алейхем маляваў жыццё тагачаснага яўрэйскага насельніцтва, адлюстроўваў усе соцыяльныя зрухі канца XIX і пачатку XX стагоддзяў, жорстка бічаваў коснасць і бескультур'е, высмейваў прадстаўнікоў прывілегіраваных класаў, гандляроў, чыноўнікаў, маклераў. Сваімі творамі, поўнымі праўды жыцця і народнай мудрасці, ён заклікаў да барацьбы супроць справедлівых соцыяльных устояў, супроць прыгнятальнікаў. Гэтым Шолам-Алейхем стаў блізкім і зразумелым шырокім народным масам. Імя яго стала любімым і блізкім працоўнаму чытачу, яго кнігі выдаваліся і выдаюцца на ўсіх мовах.

Сваёй творчасцю Шолам-Алейхем садзейнічаў культурнаму росту свайго народа. Ён не толькі проста, пачуццёва, панароднаму адлюстроўваў быт і жыццё яўрэйскіх працоўных мас, але быў выказвальнікам перадавых ідэй, ён аптымістычна і ўпэўнена глядзеў у будучыню.

Да светлых сёнешніх дзён соцыялізма дажылі працоўныя нашай неасяжнай краіны. Вялікі Кастрычнік расправіў плечы ўсім народам, раней прыгнечаным і абязздоленым. У Совецкім Саюзе знайшоў сваю сапраўдную радзіму і працоўны яўрэйскі народ. За годы совецкай улады яўрэйская соцыялістычная культура вырасла настолькі, што ніякага параўнання з мінулым, дарэволюцыйным быць не можа. У СССР яўрэйскі народ разам з усімі народамі жыве свабодным, заможным і радасным жыццём, з поспехам працуе на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва.

Пышным цветам квітнее культура яўрэйскага народа. Юбілей Маскоўскага Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра, які адзначала нядаўна ўся краіна, — яркае сведчанне гэтаму. Узнагарода лепшых яўрэйскіх пісьменнікаў, артыстаў з'яўляецца таксама доказам няспынных клопатаў партыі і совецкага ўрада аб развіцці нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу яўрэйскай культуры.

У Совецкай Беларусі яўрэйская соцыялістычная культура таксама дасягнула небывалага ўздыму. Спектаклі Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра БССР карыстаюцца заслужаным поспехам сярод шырокіх мас працоўных. Плодатворна працуюць яўрэйскія совецкія пісьменнікі, якія, авалодваючы класічнай спадчынай, імкнуцца стварыць поўнакаштоўныя літаратурныя творы. Можна прывесці дзесяткі прыкладаў, якія з'яўляюцца сведчаннем росту культуры брацкага яўрэйскага народа.

Шолам-Алейхем—гэта адно з слаўных імён, якіх не мала вылучыў з свайго асяроддзя яўрэйскі народ. Ім гардзяцца працоўныя нашай радзімы. Літаратурная спадчына яго скарыстоўваецца нашым народам для далейшага культурнага ўздыму. Совецкаму народу дораг Шолам-Алейхем як вялікі мастак, праўдзівы і яркі пісьменнік, як барацьбіт за справу працоўных.

У цеснай брацкай сям'і народы нашай краіны пабудавалі соцыялізм і няўхільна ідуць да комунізма. З вялікай сталінскай пуцёўкай, дадзенай XVIII гістарычным з'ездам партыі Леніна—Сталіна, з'еднана і дружна ўступілі яны ў трэцюю пяцігодку вялікіх работ. Зарукай далейшых бліскучых перамог на гаспадарчым і культурным фронце з'яўляецца вялікая і непарушная дружба народаў СССР, няўхільнае ажыццяўленне ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА імені ТРЭЦЯЙ СТАЛІНСКАЙ ПЯЦІГОДКІ

ЗА ПЕРШАЕ МЕСЦА Ў КАЛОНЕ ДЭМАНСТРАНТАЎ

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). Працоўныя Гомеля актыўна рыхтуюцца да міжнароднага пролетарскага свята — Першага мая. Паміж прадпрыемствамі разгарнулася спаборніцтва на права заняцця першага месца ў першамайскай калоне дэманстрантаў.

Рэзультаты работы прамысловасці горада ў першай дэкадзе красавіка паказваюць, што рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі Гомеля з чэсцю выконваюць узятыя на сябе абавязацельствы ў спаборніцтве імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі.

Дэкадны план прамысловасцю горада выкананы на 102,5 процанта. Дадаткова выпушчана прадукцыі на 203800 рублёў. Уперадзе ў спаборніцтве ідуць — мясакамбінат, які выканаў сваё дэкаднае заданне на 155,7 проц., тлушчакамбінат — на 115,3 проц., парфумерная фабрыка імені Клары Цэткін — на 113 проц., кандзіцерскі камбінат «Спартак» — на 111,9 проц., чулочна-трыкатажная фабрыка імені 8 сакавіка на 111 проц. і інш.

Перадаюць стаханаўскі вопыт

З кожным днём па менскай швейнай фабрыцы імені 8 сакавіка ўсё больш шырыцца шэфства лепшых стаханавак над адстаючымі работніцамі. Штодзенна пасля сканчэння работы стаханаўкі — пецельшчыца тав. Гур'ян, матарысткі тт. Пілюга і Талпігіна і інш. — непасрэдна ля рабочага месца перадаюць свой вопыт работы маладым работніцам. Гэтае мерапрыемства дало выдатныя вынікі. Так, напрыклад, раней адставаўшыя работніцы тт. Кураш, Юрэвіч і інш., праходзячы курс навучання ў лепшых стаханавак, зараз значна перавыконваюць свае нормы.

Рабочыя і работніцы фабрыкі паспяхова выконваюць свае абавязацельствы па спаборніцтву імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. План першай дэкады фабрыка выканала на 107 процантаў. Калектыў энергічна змагаецца за датэрміновае сканчэнне — да 25 красавіка — чатырохмесячнага задання з тым, каб даць краіне дадаткова на 80 тыс. рублёў швейных вырабаў.

Падведзены вынікі міжцэхавага соцыялістычнага спаборніцтва. Пяршынства дабіўся другі чырвонасцяжны цэх (начальнік тав. Мілінтовіч). План першай дэкады красавіка ён выканаў на 110,1 проц. У шырока разгорнутым міжбрыгадным спаборніцтве лепшых паказальнікаў дасягнула суцэльна стаханаўская брыгада тав. Кабернік. Сваё заданне за першыя 10 дзён гэтага месяца брыгада выканала на 120,5 проц. На 118 проц. выконвае сваё заданне суцэльна стаханаўская брыгада тав. Грамовіч.

Устаноўленыя з 1 красавіка новыя нормы значна перавыконваюцца большасцю работніц. Стаханавец тав. Элькінд на працэсе шнуроўкі дае 180 проц. нормы, тав. Хадачынская—144 проц., тав. Разюк — 162 проц. і т. д.

Абавязацельствы работнікаў Жалвінецкага сельсовета

ГЛУСК. (Кар. «Звязды»). Шырокі водгук знайшоў сярод членаў сельсоветаў Глускага раёна зварот старшынь сельсоветаў Маскоўскай вобласці аб уключэнні ў соцспаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. Па ўсяму раёну праходзяць расшыраныя пленумы сельсоветаў, на якіх абмяркоўваецца гэты зварот і прымаюцца канкрэтныя абавязацельствы.

13 красавіка адбыўся расшыраны пленум Жалвінецкага сельсовета. У яго рабоце прынялі ўдзел 62 чалавекі — члены сельсовета, старшыні і брыгадзіры калгасаў.

Пленум намеціў рад канкрэтных мерапрыемстваў па лепшай пастаноўцы масава-выхаваўчай работы сярод працоўных, перабудове работы совета, лепшаму абслугоўванню працоўных, а таксама па своечасовану выкананню гаспадарча-палітычных кампаній.

«Мы абавязваемся, — сказана ў рашэнні сельсовета, — сяўбу правесці ў раннія і сціслыя тэрміны—зернавых за 4 дні, бульбы за 5—6 дзён, ільну за 2 дні—з поўным захаваннем усіх агратэхнічных правіл. У калгасах правядзем падкормку і баранаванне азімых і яравых культур, даб'емся 100-процантнага захавання і вырошчвання маладняка жывёлы. Поўнасцю ліквідуем непісьменнасць і малапісьменнасць сярод працоўных сельсовета».

Поспехі паравознікаў Крычава

КРЫЧАЎ, 14 красавіка. (БЕЛТА). Усе рабочыя і служачыя Крычаўскага паравознага дэпо ахоплены соцыялістычным спаборніцтвам імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. У выніку дэпо дабілася значных поспехаў у рабоце і вышла на другое месца па Беларускай чыгунцы.

Перадавой у дэпо з'яўляецца брыгада комсамольскага паравоза № 17-153, узначальваемая маладым комуністам тав. Казубоўскім. Брыгада з дня ў дзень перавыконвае нормы па тэхнічнай і камерцыйнай скорасці, дае па 30—40 мінут нагону ў шляху. Тав. Казубоўскі днямі прывёў поезд цяжкай вагі з Крычава ў Оршу, перавыканаўшы норму тэхнічнай скорасці на 5,5 кілометра ў гадзіну і нагнаў у шляху 30 мінут. Водзяць паязды цяжкай вагі і машыністы тт. Швэдчанка, Пільнікаў, Якаўлёнак, Жукаў, Бакуменка і рад іншых.

Выдатных поспехаў дабіўся падсобны цэх дэпо. Вытворчы план за 1-ю дэкаду красавіка ён выканаў на 280 проц. Токар Жмодзікаў штодзенна выконвае норму на 300 проц. Не адстаюць ад яго і токар Старасценка, каваль Кудраўпоў, малатабоец Сакушэнка і слесар Селядкоў. У пэху няма ніводнага рабочага, які-б не выконваў нормы.

Па-стаханаўску працуе на рамонце паравозаў і комплексная брыгада тав. Ражманава. Прамывачны рамонт брыгада сістэматычна праводзіць за 6—7 гадзін замест 14 гадзін на плану, прычым работа брыгады вызначаецца высокай якасцю.

Калектыў дэпо змагаецца за тое, каб да вялікага пролетарскага свята 1 Мая заваяваць першае месца па Беларускай чыгунцы.

УРУЧЭННЕ ОРДЭНАЎ І МЕДАЛЕЙ САЮЗА ССР

14 красавіка Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР тав. М. І. Калінін уручыў ордэны і медалі вялікай групе перадавікоў сельскай гаспадаркі Беларускай ССР, узнагароджаных за выдатныя поспехі ў сельскай гаспадарцы, у асаблівасці за перавыкананне планаў па ільнаводству і жывёлагадоўлі.

Сярод узнагароджаных брыгадзіры трактарных брыгад Боркавіцкай МТС тт. І. А. Бохан, А. Ф. Быкаў і дырэктар той-жа МТС т. В. П. Варанкоў, камбайнер Жлобінскай МТС т. В. Ф. Гараўцоў, старшы аграном копыльскага райза т. І. І. Пятроў, звеннявая калгаса «Юны комунар», Чавускага раёна, т. А. І. Конзэрава, звеннявая калгаса «Комінтэрн», Чачэрскага раёна, т. А. Г. Ціткова, заг. аўпафермай калгаса «Чырвоны ўсход», Кіраўскага раёна, т. В. П. Корзун, старшыня калгаса імені Валадарскага, Магілеўскага раёна, т. І. Н. Каракін, сакратар Парыцкага райкома КП(б)Б т. П. В. Бандарэнка, старшыня калгаса «Чырвоны агароднік», Менскага раёна, т. Ф. Т. Трушкевіч і многія іншыя выдатныя майстры соцыялістычнага ўраджаю, знатныя людзі Совецкай Беларусі.

Ад імені ўзнагароджаных выступілі ордэнаносцы тт. В. Ф. Гараўцоў, І. І. Пятроў, П. В. Бандарэнка, Я. А. Жылянін. Звяртаючыся са словамі гарачай падзякі, адданасці і любві да партыі, урада, правадыра і настаўніка ўсіх працоўных таварыша Сталіна, яны абяцалі прыкласці ўсе свае сілы, веды і энергію для дасягнення новых, яшчэ больш буйных перамог на фронце соцыялістычнай сельскай гаспадаркі.

— Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета аб узнагароджанні перадавікоў сельскай гаспадаркі Беларусі, — сказаў т. **Пятроў**, — успрынят усімі калгаснікамі, спецыялістамі і работнікамі сельскай гаспадаркі як сталінская пуцёўка на новыя працоўныя подвігі. Ва ўсіх раёнах рэспублікі разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі за далейшы ўздым ураджайнасці.

— Мы, перадавікі сельскай гаспадаркі, — заявіў т. **Бандарэнка**, — запэўняем партыю і ўрад, што веснавую сяўбу правядзем па-большэвіцку, высокаякасна, з захаваннем усіх правіл высокай агратэхнікі. Мы будзем змагацца за тое, каб Беларуская рэспубліка была ў перадавых радах саюзных рэспублік і заняла пачэснае месца на Ўсесаюзнай Сельскагаспадарчай Выстаўцы.

— Мы ператворым нашы пагранічныя калгасы, — заявіў тав. **Жылянін**, — у непрыступную крэпасць абароны, і калі ворагі пасмеюць напасці на нашу радзіму, яны абламаюць сабе зубы.

Ордэны і медалі былі ўручаны таксама групе стаханаўцаў чорнай металургіі і групе перадавікоў сельскай гаспадаркі Казахскай ССР.

Пасля ўручэння ордэнаў і медалей з прамоваю выступіў тав. **М. І. Калінін.**

— Перад сельскай гаспадаркай Беларусі, — сказаў тав. Калінін, — адкрыты вельмі шырокія перспектывы. Зямля ў вас не дрэнная, а кліматычныя ўмовы вельмі добрыя, — засухі амаль ніколі не бывае. Можна смела сказаць: у Беларусі зямля дае столькі, колькі ў яе ўкладзена працы.

Я думаю, што задача, якую павінны паставіць перад сабой калгаснікі Беларусі, гэта атрымліваць не менш, чым лепшыя калгаснікі цэнтральных абласцей РСФСР, — 100 пудоў зярна з гектара. Гэта задача для вас зусім пасільна. Ну, вядома, папрацаваць прыдзецца як след. Гэта-ж не капіталістычныя часы, калі ўраджайнасць падымалася вельмі марудна. У нашых совецкіх умовах тэмпы росту ўраджайнасці павінны намнога паскорыцца.

Такую-ж задачу, — гаворыць тав. Калінін,—трэба паставіць і ў адносінах бульбы. Яе ўраджайнасць трэба падняць значна вышэй, чым зараз. Тут нельга абмежавацца ўраджайнасцю ў 100 цэнтнераў з гектара. Некаторыя калгаснікі збіраюць зараз па 100 цэнтнераў з гектара бавоўны, а гэта — культура куды больш каштоўная. Трэба было-б па-совецкі паставіць задачу збіраць 200—250 цэнтнераў з гектара, гэта 1.500 пудоў. Цыфра цярпімая (шматлікія воклічы: «Правільна, правільна!»). Цыфра зусім дапушчальная.

Глеба ў вас пясчаная, якая для бульбы якраз падыходзіць. Ну, вядома, трэба падцягнуць і тэхнічныя культуры. Калі ў мінулым Беларусь была адною з самых адсталых частак дзяржавы, то ў цяперашніх умовах яна павінна стаць адною з багацейшых частак Совецкага Саюза. У вас для развіцця тэхнічных культур умовы самыя спрыяючыя. Апрача бульбы, вы з вялікім поспехам можаце разводзіць лён, каўчуканосы і цэлы рад іншых тэхнічных культур.

Я ўжо не гавару аб развіцці садоўніцтва і гароднічтва, гэта само сабой зразумела. А вы самі ведаеце — для таго, каб атрымаць 100 пудоў хлеба і 1.500 пудоў бульбы з гектара, атрымаць добры ўраджай тэхнічных культур, для гэтага патрабуецца не толькі добрая работа, але і добрае веданне сельскай гаспадаркі.

Сёнешняе ўзнагароджанне гэта ёсць першае прызнанне вашых поспехаў, а ў другую чаргу — гэта ёсць і заданне. За вашы поспехі ўзнагароджваем, але ўпэўнены, што гэта ўзнагарода падштурхне вас на новыя поспехі. (Апладысменты).

Я не сумняваюся, што вы ўсе хочаце жыць заможным і культурным жыццём. Але адзіны шлях для дасягнення такога жыцця — гэта павелічэнне прадукцыйнасці, гэта значыць, падняцце ўраджайнасці. Жыць заможна — для гэтага не так ужо многа патрэбуецца. Але калі хочам зрабіць сваё жыццё заможным і культурным, гэта будзе каштаваць значна даражэй. Дык вось, трэба зрабіць жыццё заможным і культурным. Я лічу, што беларускія калгаснікі маюць усе магчымасці і думаю, яны прыкладуць усе свае сілы і разгарнуўшыяся таленты, каб зрабіцца такімі сельскімі гаспадарамі, у якіх прыязджалі-б вучыцца людзі з-за граніцы, глядзець і здзіўляцца, як калгаснікі ў соцыялістычнай краіне ўмеюць выкарыстоўваць матэрыяльныя і прыродныя магчымасці.

Дазвольце пажадаць усім калгаснікам, спецыялістам і работнікам сельскай гаспадаркі Беларусі ў гэтай справе поўнага поспеху.

Узнагароджаныя наладжваюць вастаржаную авацыю ў чэсць партыі і ўрада, у чэсць таварыша Сталіна.

(ТАСС).

СВАБОДНУЮ РАБОЧУЮ СІЛУ — НАШАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Наша соцыялістычная прамысловасць вырасла і ўзмацнела за годы двух сталінскіх пяцігодак. За гэты час яна забяспечыла навейшымі сельскагаспадарчымі машынамі нашы калгасы і соўгасы і гэтым самым стварыла ўсе ўмовы для далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі, для заможнага і культурнага жыцця.

Наш калгас за апошнія 3—4 годы набыў 3 аўтамашыны, трактар, складаную малатарню, дзве радковыя сеялкі, 6 жняярак, 2 касілкі, 15 культыватараў і інш. сельскагаспадарчыя машыны. Машынізацыя ўсіх работ дала нам магчымасць адпусціць многіх калгаснікаў на работу ў прамысловасць, на торфараспрацоўкі і на лесазагатоўкі.

Зараз, абмеркаваўшы просьбу таварыша Сталіна аб водпуску калгаснікаў у прамысловасць, мы яшчэ раз падлічылі ўсе нашы сілы і магчымасці і рашылі адпусціць у прамысловасць яшчэ 30 калгаснікаў. Гэта ніколькі не адаб'ецца на нашай рабоце. Наадварот, мы яшчэ лепш умацуем прапоўную дысцыпліну, ушчыльнім рабочы дзень, даб'емся яшчэ лепшых паказальнікаў у барацьбе за высокі ўраджай.

Мы заклікаем усіх калгаснікаў нашай ордэнаноснай рэспублікі з усёй шчырасцю адгукнуцца на просьбу таварыша Сталіна: перагрупіраваць свае сілы так, каб усе лішкі рабочай сілы можна было перадаць нашай прамысловасці.

Е. Т. Шантар—старшыня калгаса «Казбек», Глускага раёна.

Н. К. Селіванаў—намеснік старшыні.

В. Ф. Круглоў, Г. С. Круглоў—брыгадзіры паляводчых брыгад.

М. Г. Адынец—загадчык МТФ.

Калгаснікі-стаханаўцы: **Ц. Т. Селіванаў, М. Ф. Купчэня, Н. Г. Шаплыка, К. М. Русакоў, Н. І. Бясцвіцкі, Н. П. Алейнікаў, Ф. З. Купчэня** і іншыя (усяго 17 подпісаў).

ГЕРОІ СОВЕЦКАГА САЮЗА

(ДА ПЯЦІГОДДЗЯ З ДНЯ УСТАНАЎЛЕННЯ ЗВАННЯ)

16 красавіка 1934 года пастановаю ўрада была ўстаноўлена вышэйшая ступень адзнакі — званне Героя Совецкага Саюза.

Праз некалькі дзён пасля апублікавання пастановы гэтае званне было прысвоена сямі лётчыкам — узельнікам аперацый па выратаванню чэлюскінцаў — тт. Ляпідзеўскаму, Леванеўскаму, Молакаву, Каманіну, Слепнёву, Вадап'янаву і Дароніну.

За пяць год гэты слаўны атрад Герояў папоўніўся дзесяткамі новых імён. Плеяда Герояў Совецкага Саюза налічвае цяпер звыш 100 чалавек. Яны пакрылі сябе непагаснай славай у бязмежных арктычных прасторах, у баях ля возера Хасан, пры выкананні спецыяльных заданняў урада па ўмацаванню абароннай магутнасці Совецкага Саюза. Сярод Герояў—лётчыцы Валенціна Грызадубава, Паліна Осіпенка, Марына Раскова, танкіст Вінакураў, лётчык Громаў, урач Бегоулеў, палярнік Папанін, вучоны Шыршоў, пагранічнік Батаршын і многія іншыя.

Назаўсёды астанецца ў народнай памяці вобраз вялікага лётчыка нашага часу Героя Совецкага Саюза Валерыя Паўлавіча Чкалава, вобраз камісара Пажарскага.

Героі Совецкага Саюза вядуць вялікую дзяржаўную работу. Многіх з іх совецкі народ выбраў у свой вышэйшы орган — Вярхоўны Совет СССР. (ТАСС).

ВЕЧАР ПАМЯЦІ ШОЛАМ-АЛЕЙХЕМА

Інстытут сусветнай літаратуры імені Горкага і Дзяржаўны яўрэйскі тэатр правялі 13 красавіка адкрытае пасяджэнне, прысвечанае 80-годдзю з дня нараджэння Шолам-Алейхема. Ушаноўваць класіка яўрэйскай літаратуры сабраліся пісьменнікі, акадэмікі, тэатральныя дзеячы, мастакі, студэнцкая моладзь сталіцы СССР.

Адкрываючы пасяджэнне, акадэмік А. Н Талстой адзначыў глыбокую народнасць твораў Шолам-Алейхема, велізарную любоў і папулярнасць, якія набыў пісьменнік у шырокіх кругах чытачоў.

Даклад аб творчым шляху пісьменніка зрабіў прафесар І. М. Нусінаў. Шолам-Алейхему на сцэне прысвяціў свой даклад народны артыст СССР С. М. Міхоэлс.

Затым адбыўся вялікі канцэрт. Былі выкананы творы Шолам-Алейхема.

(ТАСС).

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Аб узнагароджанні Пачотнай Граматай Вярхоўнага Совета БССР Магілеўскай музыкальнай школы імені Рымскага-Корсакава ў сувязі з 20-годдзем школы

У сувязі з 20-годдзем школы і за значныя поспехі, дасягнутыя ў галіне развіцця музыкальнага мастацтва, — узнагарадзіць Магілеўскую музыкальную школу імені Рымскага-Корсакава пачотнай граматай Вярхоўнага Совета БССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
Н. НАТАЛЕВІЧ.

Чва сакратара Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
С. МАРОЗАЎ.

14 красавіка 1939 г. г. Менск.

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Аб узнагароджанні работнікаў Магілеўскай музыкальнай школы імені Рымскага-Корсакава ў сувязі з 20-годдзем школы

У сувязі з 20-годдзем Магілеўскай музыкальнай школы імені Рымскага-Корсакава і за заслугі ў развіцці музыкальнага мастацтва ўзнагарадзіць:

ПАЧОТНАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

1. **Зісмана** Лазара Мордухавіча — дырэктара школы.

ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

1. **Еўстратава** Аляксандра Фёдаравіча — заг. вучэбнай часткай школы, выкладчыка па класу скрыпкі.
2. **Мерыіну** Іду Лазараўну — выкладчыка па класу фортэпіяна.
3. **Юшкевіча** Леапольда Ісаевіча — выкладчыка па класу віяланчэлі.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
Н. НАТАЛЕВІЧ.

Чва сакратара Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
С. МАРОЗАЎ.

14 красавіка 1939 г. г. Менск.

15-ГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ КАЛГАСА

ВІЦЕБСК. (Кар. «Звязды»). У красавіку 1924 года ў Вайханскім сельсавеце, Гарадоцкага раёна, арганізаваўся калгас імені Леніна, у які ўступіла 7 гаспадарак. Меў калгас тады толькі 150 гектараў зямлі.

За 15 год твар калгаса карэнным чынам змяніўся. Калгас зараз мае 1.335 гектараў зямлі, 98 коней, 218 кароў, 97 авечак і іншую жывёлу. У мінулым годзе калгас дабіўся ўраджаю яравой пшаніцы 15,9 цэнтнера з гектара, ячменю — 14,5 цэнтнера.

Былы старшыня калгаса тав. Рыбакоў зараз старшыня райвыканкома Гарадоцкага раёна, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР. Брыгадзір калгаса тав. І. Знакаў двойчы ўзнагароджан урадам ордэнам «Знак почета» і медаллю «За трудовую доблесть». Старшыня калгаса Васілій Харытонаў узнагароджан медаллю «За трудовое отличие».

Іс. ХРАПУНОВІЧ.

ПАЧАЛАСЯ ЗДАБЫЧА ТОРФУ

ГОМЕЛЬ. 14 красавіка на торфазаводзе «Большэвік» пачаўся торфасезон. Працавалі 4 элеватарныя машыны. Першай на работу выйшла брыгада знатнага тарфяніка Беларусі т. Зубава, а таксама брыгады тт. Карнеенка, Жугавец і Гладчанка. Сёння праводзілася апрабаванне на рабочым ходу 10 багераў. Работа машын паказала добрую якасць рамонту.

Усяго ў бліжэйшыя дні пачнуць працаваць 10 багераў, 6 элеватарных і 6 скрэперных машын.

П. І. КАЛАМЕЕЦ.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

УМАЦОЎВАЕМ КАЛГАСНЫЯ ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ

Статут партыі, прыняты XVIII з'ездам ВКП(б), адлюстроўвае веліч перамог сацыялізма у нашай краіне, адлюстроўвае змяненні, якія адбыліся ў класавай структуры насельніцтва. У сваім дакладзе на XVIII з'ездзе ВКП(б) аб адмене катэгорый па прыёму ў партыю тав. Жданаў сказаў: «Новы парадак аблягчае адбор лепшых людзей у партыю, аблягчае стварэнне поўнакроўных партыйных арганізацый, у прыватнасці ў вёсцы, дзе сетка партыйных арганізацый асабліва недастаткова».

Рашэнне гістарычнага XVIII з'езда партыі і прыняцце статута партыйныя і непартыйныя большэвікі ўсёй нашай краіны сустрэлі поўным адабрэннем, магутным палітычным уздымам. Многія перадавыя людзі калгасаў, прамысловасці і ўстаноў Крупскага раёна ў незабыўныя дні работы з'езда ўступілі ў рады партыі Леніна—Сталіна. Характэрна, што калі за 1937—1938 гг. па раёну было прынята ў партыю толькі 64 чалавекі, то за 3 месяцы гэтага года ў партыю прынята 59 чал. Сярод прынятых—26 калгаснікаў, 4 трактарысты-камбайнеры і 10 рабочых прамысловасці і чыгуначнага транспарта.

Вялікую работу па прыёму ў партыю правялі партарганізацыі Крупскай, Ігрушаўскай МТС і Бобрская тэрытарыяльная пярвічная партыйная арганізацыя.

У часе работы XVIII з'езда ў партыю прынят старшыня калгаса «Победа», Бобрскага сельсовета, тав. Снігір. Гэты калгас з'яўляецца перадавым па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. У партыю таксама прыняты тт. Марцінкевіч Стася — камбайнер Крупскай МТС: Шабайла — трактарыст; Шумская — работніца ільназавода; Гвоздзік — урач; Пантаплёў — дырэктар Выдрыцкай школы; Раманоўская — настаўніца і інш. Усе гэтыя таварышы з'яўляюцца лепшымі агітатарамі, яны з дня ў дзень вядуць палітмасавую работу сярод працоўных па растлумачэнню гістарычных рашэнняў XVIII з'езда.

За лік новага папаўнення райком партыі нядаўна арганізаваў 4 пярвічныя партарганізацыі і дзве партыйна-комсамольскія групы.

XVIII з'ездам ВКП(б) вялікая ўвага ўдзелена ўмацаванню партыйных арганізацый на сяле. Адсюль перад намі стаіць задача — умацаваць існуючыя партарганізацыі і дабіцца стварэння новых партарганізацый у буйнейшых калгасах. За ажыццяўленне гэтай задачы райком партыі зараз узяўся рашуча. Мы ўжо дабіліся некаторых рэзультатаў, праўда, пакуль што гэта з'яўляецца пачаткам, першым крокам. Райком паслаў на пастаянную работу ў вёску 7 комуністаў з ліку раённага партыйнага актыва. Пасланыя комуністы па-большэвіцку ўзяліся за ўмацаванне калгасаў, за падрыхтоўку да веснавой сяўбы.

Таварыш Сталін у сваім дакладзе на з'ездзе партыі гаварыў: «Правільна падбіраць кадры, гэта значыць:

Па-першае, цаніць кадры, як залаты фонд партыі і дзяржавы, даражыць імі, мець да іх павагу.

Па-другое, ведаць кадры, старанна вывучаць дастоінствы і недахопы кожнага кадравага работніка, ведаць, на якім пасту могуць лягчэй за ўсё разгарнуцца здольнасці работніка».

Гістарычныя ўказанні правадыра народаў ляглі ў аснову работы нашай партарганізацыі. За дні работы XVIII з'езда райком вылучыў рад таварышаў на адказныя пасады. Вось, напрыклад, тав. Ефімаў, які ў сакавіку гэтага года прынят ў члены партыі, вылучан зараз намеснікам райупаўнаркамзага. Тав. Дароўскіх вылучан дырэктарам Крупскай МТС і т. д.

Райкомам партыі праведзен рад мерапрыемстваў па рэалізацыі рашэнняў XVIII з'езда і арганізацыі глыбокага вывучэння даклада таварыша Сталіна сярод комуністаў і беспартыйных мас. Ва ўсіх пярвічных партарганізацыях арганізаваны гурткі і вылучаны прапагандысты. У дапамогу пярвічным партарганізацыям райкомам паслана 22 падрыхтаваныя комуністы з райпартактыва.

Адным з недахопаў работы райкома партыі з'яўляецца тое, што ўсё яшчэ недастаткова наладжана работа з новапрынятымі ў партыю таварышамі, якія нідзе не займаюцца і самастойна не вывучаюць «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)».

Узброіўшыся дакладам правадыра народаў таварыша Сталіна і гістарычнымі рашэннямі XVIII з'езда партыі, партыйныя і непартыйныя большэвікі раёна будуць пабольшэвіцку змагацца за выкананне плана трэцяй сталінскай пяцігодкі, за лепшае і добраякаснае правядзенне веснавой сяўбы, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў.

П. А. ТРЭЦЯКОЎ,
сакратар Крупскага РК КП(б)Б.

ПЕРАДАВЫЯ ЛЮДЗІ ЎСТУПАЮЦЬ У РАДЫ ПАРТЫІ

МОЗЫР. Прыток заяў перадавых людзей прамысловасці і сельскай гаспадаркі аб уступленні ў рады партыі Леніна—Сталіна павялічваецца з кожным днём. За прайшоўшыя тры месяцы гэтага года прынята ў кандыдаты ВКП(б) 62 чалавекі і пераведзена в кандыдатаў у члены 17. У гэтым ліку толькі за сакавік месяц прыняты ў партыю 53 таварышы.

Сярод прынятых — механік фабрыкі «Профінтэрн» тав. Вікенцьеў, начальнік лесмехпункта т. Карнеявец, старшы машыніст станцыі Калінкавічы т. Доўгі, брыгадзір трактарнай брыгады МТС т. Федарэнка, дырэктар сярэдняй школы т. Шульга і інш. Асабліва вялікую работу па прыёму ў партыю праводзяць партарганізацыі Юравіцкага і Бярозаўскага сельсоветаў, а таксама Калінкавіцкага горсовета.

Папаўненне радоў партыі ў сувязі з рашэннямі XVIII з'езда ВКП(б) дало магчымасць стварыць на сяле рад новых пярвічных партарганізацый. Так з 6 новаарганізаваных партарганізацый 3 арганізаваны на сяле.

А. КАЦМАН.

АГІТБРЫГАДА ПА ВЫВУЧЭННЮ МАТЭРЫЯЛАЎ XVIII З'ЕЗДА ВКП(б)

ВІЦЕБСК. (Кар. «Звязды»). Па ініцыятыве Чарэйскага дома соцкультуры (Чашніцкі раён) арганізавана агітбрыгада з комсамольскага актыва па вывучэнню з калгаснікамі Чарэйскага сельсовета матэрыялаў гістарычнага XVIII з'езда ВКП(б).

У сваім распараджэнні агітбрыгада мае цукавую кіноперасоўку, бібліятэчку і мастацкую літаратуру.

Першы выезд брыгада зрабіла ў калгас «Правда», дзе праводзілася вывучэнне даклада таварыша Сталіна. Тут-жа была выпушчана насценная газета, прысвечаная рашэнням з'езда і правядзенню веснавой сяўбы. Калгаснікі асталіся задаволенымі работай брыгады. Зараз брыгада выехала ў іншыя калгасы сельсовета.

НА КАЛГАСНЫХ ПАЛЯХ

ПАСЕЕМ У СЦІСЛЫЯ ТЭРМІНЫ

Мая брыгада ўсю сваю работу пачала з арганізацыі працы. Летась у нас яшчэ не было правільнай расстаноўкі рабочай сілы. Некаторыя калгаснікі не выходзілі на работу. Сёлета мы гэта ўлічылі і арганізавалі 6 пастаянных звенняў—па бульбе, ільну і зернавых. У кожным з іх па 10 чалавек. За звеннямі замацаваны ўчасткі пасеваў азімых, зернавых, гародніны.

Усе калгаснікі брыгады аднадушна ўключыліся ў соцыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. Першыя дні палявых работ паказалі, што звенні правільна зразумелі свае абавязкі. Усе калгаснікі гараць жаданнем як мага лепш правесці сяўбу.

Звенні тт. Крыліцкага і Аўрамчыка змагаюцца за 400 цэнтнераў бульбы з кожнага гектара на плошчы ў 3 гектары, па 150 цэнтнераў бульбы з плошчы ў 15 гектараў. Звенні вывезлі на поле па 400 тон гною, сабралі па 1,5 тоны попелу, пад рыхтавалі па 2 тоны калійнай солі. Так рыхтуюцца ўсе звенні брыгады.

У брыгадзе 62 калгаснікі. Я расставіў сілы так, каб ушчыльніць кожны рабочы дзень, павысіць прадукцыйнасць працы.

План сяўбы ў 92 гектары брыгада правядзе ў самыя раннія, сціслыя тэрміны са строгім захаваннем усіх агратэхнічных правілаў.

А. А. АЎРАМЧЫК,
брыгадзір паляводчай брыгады калгаса «Палітаддзелец», Малеўскага сельсовета, Бабруйскага раёна.

РАСПАЧАЛІ СЯЎБУ

БЫХАЎ. 15 калгасаў раёна прыступілі да палявых работ. На 11 красавіка было ўзарана пад яравыя культуры 80 гектараў. Калгас «Чырвопая рошча», Дунайкаўскага сельсовета, узараў 23 гектары, «Чырвоны шлях», Баркалабаўскага сельсовета,—15 гектараў і калгас імені Чапаева, Узніцкага сельсовета,—10 гектараў.

Асобныя калгасы раёна, як «Чырвонаармеец», «Сталінскі шлях», прыступілі да сяўбы яравых культур.

Г. ПАЎЛАЎ.

ДЗЕ-Ж БАРАЦЬБА ЗА ВІЛЬГАЦЬ?

ГЛУСК, 14 красавіка. (Кар. «Звязды»). Калгасы раёна сустрэлі веснавую сяўбу лепш падрыхтаванымі, чым у мінулым годзе. Перадавыя калгасы раёна, каб забяспечыць максімальнае захаванне вільгаці і атрыманне высокіх ураджаяў, паспяхова выконваюць свае абавязацельствы, вядуць палявыя работы хутка і высокаякасна. Можна, як прыклад, прывесці калгасы — «Казбек», Ляскавіцкага сельсовета, які пасеяў ужо 43 гектары зернавых, «Камінтэрн», таго-ж сельсовета, — 32 гектары, імені Молатава, Жалвінецкага сельсовета, — 38 гектараў і т. д. У гэтых калгасах разгарнулі палявыя работы, не чакаючы высыхання вялікіх плошчаў. Тут змагаюцца за высокую якасць сяўбы. Гэтаму многа садзейнічала ліквідацыя абязлічкі, стварэнне пастаянных звенняў і замацаванне за імі ўчасткаў у паляводчых брыгадах.

І ўсё-ж трэба прызнаць, што ўзоры барацьбы за сціслыя тэрміны і за высокую якасць паказваюць далёка не ўсе калгасы раёна. Больш таго, у некаторых калгасах дапускаюцца грубейшыя парушэнні агратэхнікі, вялікі разрыў паміж падрыхтоўкай глебы і сяўбой. Усяго па раёну для сяўбы падрыхтавана звыш 3.000 гектараў, а засеяна толькі каля 700 гектараў.

Больш палавіны зернавых пасеяна ручным спосабам, хаця ў раёне ёсць 78 трактарных і конных сеялак. Радковыя сеялкі скарыстоўваюцца нездавальняюча. 8 конных сеялак зусім не адрамантаваны, рад трактарных сеялак не маюць аўсяных шасцяронак, што не дае магчымасці праводзіць радковую сяўбу аўса. У калгасе «Чырвоны пуцілавец», Казловіцкага сельсовета, сяўбу праводзяць ручным спосабам, хаця тут ёсць сеялка. Гэтак-жа паступаюць у суседнім калгасе «Зара комуны».

У раёне не падрыхтаваліся да пратручвання насення. Толькі 84 калгасы са 114 выбралі са складаў Сельгасснаба прызначаныя для пратручвання насення хімікаты. У калгасах «Чырвоны сцяг» (старшыня тав. Драпеза) і «Чырвоная зорка» (старшыня тав. Сасноўскі) дапусцілі сяўбу аўса непратручаным насенем. Падобныя факты наглядаюцца і ў калгасе імені Молатава, Бярозаўскага сельсовета.

Вельмі дрэнна разгортваецца яравізацыя насення. Справа ў тым, што ў раёне своечасова не паклапаціліся падрыхтаваць кадры яравізатараў. На курсах яравізатараў павінна было навучацца 32 калгаснікі, а навучалася толькі 14. І вось цяпер у райземаддзеле і МТС няспынна трашчаць тэлефоны. З многіх калгасаў і сельсоветаў звоняць, пытаюцца, як праводзіць яравізацыю. У райземаддзеле бездапаможна разводзяць рукамі: «дзе-ж мы забяспечым усе калгасы кансультацыяй».

Першыя дні пасеўных работ паказваюць, што не зусім арганізавана сустрэлі вясну машынна-трактарныя станцыі раёна. У МТС імені 20-годдзя Кастрычніка (дырэктар тав. Хмялёў) кожны дзень у сярэднім прастойваюць 5 трактараў. З 6 красавіка стаіць трактар «СТЗ-НАЦІ» ў калгасе «VII з'езд Советаў». Озямлянскага сельсовета, з-за адсутнасці вентылятарнага пасіка.

Пакуль-што кіруючыя арганізацыі раёна не прынялі неабходных мер для таго, каб пакончыць з фактамі грубейшых парушэнняў агратэхнікі і прастояў трактараў, якія наглядаюцца ў першыя дні сяўбы.

В. АСТРОЎСКІ.

ЗВЕННІ ВЫСОКАГА ЎРАДЖАЮ

РЭЧЫЦА, 13 красавіка. (Кар. «Звязды»). Перадавыя калгасы раёна шырока разгарнулі соцыялістычнае спаборніцтва імені Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі за высокі ўраджай. У гэтым годзе калгасы шырока прымяняюць баранаванне азімых, яравізацыю, падкормку і іншыя агратэхнічныя мерапрыемствы.

У калгасе імені Менжынскага палявыя работы пачаліся 9 красавіка. Калгаснікі захоўваюць кожную кроплю вільгаці. Глеба перад узорваннем абавязкова перабараноўваецца. Да 12 красавіка тут узарана 20 гектараў, прабаранавана 30 гектараў азімых і пасеяна канюшына. Аміячнай селітрай падкармліваецца жыта і пшаніца на плошчы 13 гектараў.

У калгасе арганізавана 22 звяны высокіх ураджаяў. Яны разгарнулі паміж сабою соцыялістычнае спаборніцтва за 22 цэнтнеры аўса, 18 цнт. ячменю, 18 цнт. пшаніцы, 5 цнт. валакна і за 6,5 цнг. ільнасемя з кожнага гектара. Усе брыгады разбіты на 28 пастаянных звенняў. Сяўбу зернавых калгас закончыць за 4 дні і бульбы—за 7 дзён.

З першых дзён палявых работ нормы на ворыве перавыконваюцца. Аратыя А. В. Супранок, А. І. Супранок кожны дзень выворваюць чарай валоў па 80 сотак замест нормы 35 сотак.

Калгас «Соцыялізм» засеяў пшаніцай і ячменем 15 гектараў, падрыхтаваў для сяўбы 50 гектараў і забаранаваў 80 гектараў азімых.

Узоры стаханаўскай работы паказваюць таксама перадавыя трактарныя брыгады і трактарысты. Асобныя трактарысты з першых дзён выхаду ў поле перавыконваюць нормы на ворыве і сяўбе. Трактарысты Доўгалашчэй і Фядорчанка за 2 змены ўзаралі ў калгасе «Соцыялізм» трактарам «СТЗ-НАЦІ» да 20 гектараў.

Асабліва добра працуе комсамольская трактарная брыгада (брыгадзір Максім Барсук). Трактарысты разгарнулі індывідуальнае спаборніцтва за перавыкананне норм і за высокую якасць работ. Трактарыст Іван Галка за дзень забаранаваў у калгасе «Сталінскі гарадок» 13 гектараў, Сяргей Стрыжак закультывіраваў у калгасе «Совецкая Беларусь» 30 гектараў.

Д. МАЛЕВІЧ.

ТРАКТАРЫСТЫ ПЕРАВЫКОНВАЮЦЬ НОРМЫ

ХОЙНІКІ, 14 красавіка. Соцыялістычнае спаборніцтва, разгорнутае паміж брыгадамі і трактарыстамі Рудакоўскай і Хойніцкай МТС, дае добрыя вынікі. Брыгада тав. Багданенка (Рудакоўская МТС) з чэсцю выконвае свае абавязацельствы. Трактарыст тав. Жабіт за тры змены ўзараў 30 гектараў замест 21,6 па норме. Высокай выпрацоўкі дабіўся трактарыст тав. Мятліцкі: пры норме ў 7,2 гектара за змену ён узорвае 13 гектараў. Штодзенна перавыконваюць нормы выпрацоўкі трактарысты брыгад тт. Дашука і Багданенкі. Калгаснікі даюць добрую ацэнку рабоце трактарыстаў.

Значных поспехаў дабілася маладзёжна-жаночая брыгада МТС. Пры высокай якасці работ трактарыстка М. Жук за тры змены на трактары ХТЗ узарала 18,5 гектара пры норме 12.

Нядрэнных вынікаў у спаборніцтве дабілася і маладзёжна-жаночая брыгада Хойніцкай МТС. Уступіўшы ў спаборніцтва, трактарысткі абавязаліся ўзараць не менш 600 гектараў на кожны трактар. За выкананне гэтага абавязацельства яны змагаюцца па-стаханаўску. Працуючы на поле калгаса «Чырвоны араты», трактарысткі Анна Судзенка і Алеся Назарэнка сістэматычна перавыконваюць нормы. (БЕЛТА).

БАЙЦЫ І КАМАНДЗІРЫ ВЫВУЧАЮЦЬ РАШЭННІ З'ЕЗДА

Чырвонаармейцы, камандзіры і палітработнікі Н-скай часці з вялікім натхненнем сустрэлі рашэнні XVIII з'езда партыі Леніна—Сталіна. Кожны вечар збіраюцца яны групамі ў ленінскім пакоі, каб калектыўна прапрацаваць матэрыялы XVIII з'езда партыі. Агітатары—комсамольцы тт. Ермалаеў, Бескаравайны і Дарын праводзяць гутаркі аб гістарычных рашэннях з'езда.

Ленінскі пакой добра афармлен вітрынай, дыяграмамі. Каля плаката з табліцай з даклада таварыша Сталіна «Рост прамысловасці СССР і галоўных капіталістычных краін за 1913—1938 гг.» размясціліся чырвонаармейцы. Намеснік палітрука тав. Ермалаеў падрабязна растлумачвае кожны тэзіс даклада таварыша Сталіна. Погляды байцоў накіраваны да табліцы. Цыфры гавораць аб велізарным росце доменных пячэй, шахт, нафтавых вышак, заводаў, фабрык і т. д.

Агітатар — кандыдат ВКП(б) тав. Дарын, развіваючы расказ тав. Ермалаева, гаворыць аб тым, як проста і зразумела у сваім дакладзе таварыш Сталін ізлажыў складаную і заблытаную міжнародную абстаноўку. У часе вывучэння мудрага сталінскага даклада, рашэнняў большэвіцкага з'езда байцы заявілі, што фашысцкая мара — далучыць слана да казяўкі — ніколі не ажыццявіцца, а калі яны захочуць паспрабаваць гэта, то смярцельных кашуль для іх у нас хопіць.

У дні прапрацоўкі даклада таварыша Сталіна і матэрыялаў XVIII з'езда выдатнікі баявой і палітычнай падрыхтоўкі падаюць дакладныя запіскі аб залічэнні іх на пажыццёвую службу ў кадрах Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Тав. Панкевіч у сваёй дакладной запісцы піша: «Я прашу камандаванне часці залічыць мяне на ўсё жыццё служыць ў любімай Чырвонай Арміі. Званне воіна РСЧА я заўсёды апраўдаю і за маці-радзіму, за справу партыі Леніна—Сталіна і любімага Сталіна не пашкадую ні жыцця, ні крыві».

У часе гутарак байцы, камандзіры і палітработнікі адзінай думкай выражаюць, што яны заўсёды будуць памятаць указанні таварыша Сталіна аб капіталістычным акружэнні і гатовы ў любую мінуту выканаць заданні Рабоча-Сялянскага ўрада, партыі Леніна—Сталіна і любімага правадыра—таварыша Сталіна.

А. ОСІПАЎ.

У брыгадах і звеннях калгаса «Чырвоны араты» (Камарынскі раён, Палескай вобласці) калгаснікі вывучаюць матэрыялы XVIII з'езда ВКП(б). НА ЗДЫМКУ: стаханаўскае звяно па тэхнічных культурах вывучае прамову тав. Андрэева на XVIII з'ездзе партыі. Злева направа: Г. Ф. Леоненка, А. Ф. Пугач(звеннявая) і А. М. Гармель.
Фото Б. М. Хеніна (Фотахроніка БЕЛТА).

У дапамогу прапагандысту

АБ КОМУНІСТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ ПРАЦОЎНЫХ

Працэс соцыялістычнага будаўніцтва в'явіўся найвялікшай школай комуністычнага выхавання працоўных нашай краіны. Ствараючы новую, соцыялістычную эканоміку, новую, соцыялістычную сістэму гаспадаркі, дыктатура пролетарыята, кіруемая партыяй Леніна—Сталіна, змяняла ў людзей погляды на працу, ператварала і ператварыла працу ў справу чэсці, справу славы, справу доблесці і геройства. У нетрах другой пяцігодкі ўзнік непераадалімы рух сучаснасці — стаханаўскі рух, які з'яўляецца вышэйшай формай соцыялістычнага спаборніцтва, які мае ў сабе расткі новых, комуністычных адносін да працы, новай сістэмы арганізацыі працы.

За час двух сталінскіх пяцігодак мы ліквідавалі перажыткі капіталізма ў эканоміцы. У нашай краіне цяпер непадзельна пануе соцыялістычная сістэма гаспадаркі і соцыялістычная ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці. Не толькі ліквідаваны эксплуататарскія класы, але і прычыны, параджаючыя класы, класавы гнёт і эксплуатацыю. Цяпер у нас няма глебы для росту капіталістычных элементаў. Соцыялістычная сістэма гаспадаркі выключае такі рост.

Але мы яшчэ далёкі ад поўнай ліквідацыі перажыткаў капіталізма ў сазнанні людзей. Капіталізм вякамі насаджаў сярод працоўных сваю мараль, свае традыцыі, свае эксплуататарскія законы і нормы.

Ліквідацыя ўсіх гэтых і іншых перажыткаў капіталізма прадстаўляла сабой найтруднейшую задачу, патрабавала велізарных намаганняў з боку дыктатуры пролетарыята, намаганняў, разлічаных на дзесяцігодзі. Труднасць гэтай задачы заключалася ў тым, што посьбітамі традыцый і перажыткаў капіталізма з'яўляліся мільёны людзей. «Сіла прывычкі мільёнаў і дзесяткаў мільёнаў — самая страшная сіла» (Ленін, т. XXV, стар. 190).

Ленін надаваў велізарнае значэнне першым комуністычным суботнікам, ствараемым па ўласнаму пачыну рабочымі, ён бачыў у іх сродак для выхавання новых, комуністычных адносін да працы, пераадалення перажыткаў капіталізма ў сазнанні людзей, пераадалення коснасці, невуцтва, заскарузлых прадрассудкаў, самсаваных нораваў ва ўсіх галінах жыцця людзей.

«Гэта — пачатак пераману, больш цяжкага, больш істотнага, больш карэннага, больш рашаючага, чым звяржэнне буржуазіі, бо гэта — перамога над уласнай коснасцю, распушчанасцю, дробна-буржуазным эгаізмам, над гэтымі прывычкамі, якія пракляты капіталізм пакінуў у спадчыну рабочаму і селяніну. Калі гэтая перамога будзе замацавана, тады і толькі тады новая грамадская дысцыпліна, соцыялістычная дысцыпліна будзе створана, тады і толькі тады зварот назад, да капіталізма, стане немагчымым, комунізм зробіцца сапраўды непераможным» (Ленін, т. XXIV, стар. 329).

Ініцыятарам, тварцом новай, комуністычнай дысцыпліны працы мог стаць і сапраўды стаў у нашай краіне пролетарыят, як паслядоўна рэволюцыйны клас, створаны, арганізаваны, згуртаваны, абучаны, загартованы ў баях з капіталізмам.

Рабочы клас нашай краіны, кіруючы працоўнымі масамі, будуючы новую, соцыялістычную сістэму гаспадаркі, ствараў новыя грамадскія сувязі, новую працоўную дысцыпліну, новую арганізацыю працы, якая з'яўлялася спалучэннем вышэйшых дасягненняў навукі і тэхнікі з аб'яднаннем свядомых работнікаў, творачых новае жыццё.

Наша соцыялістычная радзіма пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна за кароткі гістарычны адрэзак часу прайшла доўгі шлях развіцця, дабілася сусветна-гістарычных перамог. У нашай краіне непадзельна пануе соцыялістычная сістэма гаспадаркі і соцыялістычная ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці, ліквідаваны назаўсёды эксплуататарскія класы, карэнным чынам пераароблена прырода працоўных класаў — рабочых і сялян, зменены састаў і прырода совецкай інтэлігенцыі, ліквідаваны перажыткі капіталізма ў эканоміцы.

Але наша грамадства яшчэ не перастала быць класавым. Яно складаецца з двух прыязных класаў — з рабочых і сялян, грані між якімі сціраюцца, падаюць, знікаюць. Сціраюцца таксама грані між рабочымі і сялянамі, з аднаго боку, і інтэлігенцыяй — з другога, але яны яшчэ поўнасцю не сцёрліся, і пройдзе яшчэ нямала часу, пакуль знікнуць апошнія адрозненні між работнікамі разумовай і фізічнай працы.

Соцыялістычная сістэма гаспадаркі змяніла ў корані прыроду рабочых і сялян, змяніла ў корані іх быццё і мышленне, падарвала ў корані процілегласць між горадам і вёскай, але рабочы клас і сялянства яшчэ не страцілі сваіх класавых прызнакаў, не перасталі быць класамі. Яны яшчэ адрозніваюцца адзін ад аднаго па свайму становішчу ў грамадстве, па ўзроўню сазнання.

Класавыя грані між рабочымі і сялянамі ў перыяд соцыялізма знаходзяць сваё выражэнне ў існаванні двух відаў соцыялістычнай уласнасці. Рабочы клас занят у прадпрыемствах дзяржаўна-соцыялістычных, маючых агульнанародны характар, а клас сялян занят у прадпрыемствах кааператыўна-соцыялістычных, якія прадстаўляюць не дзяржаўную ўласнасць, а ўласнасць асобных калектываў. Дзяржаўныя соцыялістычныя прадпрыемствы з'яўляюцца вядучымі прадпрыемствамі ў краіне не толькі таму, што яны прадстаўляюць нашу індустрыю — матэрыяльную базу соцыялізма, але і таму, што яны выражаюць сабою вышэйшы тып грамадскіх прадпрыемстваў.

Рабочы клас кіруе сялянствам, перавыхоўвае працоўных, рабочы клас разам з сялянствам і інтэлігенцыяй дзейнічае ў адной упражцы, складаюць адзіны працоўны фронт, актыўна твораць комуністычнае жыццё.

Але гэта зусім не значыць, што ўсе рабочыя і сяляне з'яўляюцца аднолькава перадавымі і аднолькава свядомымі, што ў іх асяроддзі няма ўжо адсталых працоўных. Ёсць розніца паміж рабочымі, сялянамі і інтэлігенцыяй. Ёсць розніца ў сазнанні паміж асобнымі групамі рабочых, сялян, служачых.

«І сярод рабочых ёсць перадавыя і ёсць адсталыя, не гаворачы ўжо аб уродах. Таксама і сярод сялян: ёсць і перадавыя, ёсць і адсталыя. Ёсць, вядома, і горш, чым проста адсталыя. Перадавыя людзі нашага часу з'яўляюцца актыўнымі і самаадданымі будаўнікамі комунізма, лепшымі барацьбітамі за ўмацаванне нашай дзяржавы. За гэтымі перадавымі людзьмі нашага грамадства ўжо свядома ідзе пераважная маса рабочых і сялян» (Молатаў, даклад на XVIII з'ездзе партыі).

Комуністычнае выхаванне працоўных накіравана на тое, каб вышпрацаваць у іх комуністычныя адносіны да працы, да соцыялістычнай уласнасці, да дзяржавы. Без глыбокага комуністычнага выхавання мы не зможам забяспечыць пераходу нашай краіны ад соцыялізма да комунізма. У пяжкія дні грамадзянскай вайны Ленін пісаў:

«Комунізм пачынаецца там, дзе паяўляюцца самаадданыя, пераадольваючыя цяжкую працу, клопаты **радавых рабочых** аб павелічэнні прадукцыйнасці працы, аб ахове **кожнага пуда хлеба, вугалю, жалеза** і іншых прадуктаў, якія дастаюцца не працуючым асабіста і не іх «бліжнім», а «дальнім», г. зн. усяму грамадству ў цэлым, дзесяткам і сотням мільёнаў людзей, аб'яднаных спачатку ў адну соцыялістычную дзяржаву, потым у Саюз Совецкіх рэспублік» (Ленін, т. XXIV, стар. 342).

Гэтае палажэнне Леніна не толькі не страціла свайго значэння, але набыло сваю асобую актуальнасць і сілу для бягучага перыяду развіцця. Гэтым палажэннем ленінізма неабходна строга кіравацца, выхоўваючы ў працоўных нашай краіны комуністычна-свядомыя адносіны да працы, да дзяржавы.

У аснове нашай эканомікі ляжыць соцыялістычная ўласнасць на прылады і сродкі вытворчасці. Гэтая ўласнасць стваралася ў жорстких бітвах з эксплуататарскімі класамі і з усімі наймітамі капіталістычнага акружэння, якія пробавалі раскрадваць гэтую ўласнасць і тым самым імкнуліся падарваць эканамічную базу дыктатуры рабочага класа. Партыя і совецкая ўлада вымушаны былі выдаць у жніўні 1932 года спецыяльны закон аб ахове соцыялістычнай уласнасці. Гэты закон адыгрываў і адыгрывае вялікую ролю ў барацьбе з ворагамі соцыялістычнай уласнасці. Але комуністычныя адносіны да соцыялістычнай уласнасці маюць на ўвазе не толькі ахову ўласнасці ад зладзеяў, раскрадальнікаў і шкоднікаў, але і максімальна беражныя адносіны працоўных да прылад і сродкаў вытворчасці.

Адной з вялікіх задач комуністычнага выхавання працоўных з'яўляецца выхаванне совецкага патрыятызма для абароны соцыялістычнай радзімы ад капіталістычных дранежнікаў.

Наш совецкі патрыятызм не мае нічога агульнага з буржуазным патрыятызмам, які пакоіцца на прыгнечанні сільнымі нацыямі слабых, на падаўленні іх эканамічных і матэрыяльна-культурных інтарэсаў. Наш патрыятызм глыбока інтэрнацыянальны. Ён пастаўлен на службу ўмацаванню першага соцыялістычнага грамадства — СССР, які з'яўляецца бацькаўшчынай для працоўных усяго свету. Кожны крок, накіраваны на ўмацаванне эканамічнай і ваеннай магутнасці соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян, з'яўляецца ўкладам у справу барацьбы за мір паміж народамі, у справу барацьбы супроць вайны і фашызма, накіраван на ўмацаванне пазіцый працоўных капіталістычных краін у барацьбе з эксплуататарамі.

У справе комуністычнага выхавання працоўных адыгрывала і павінна адыгрываць велізарную ролю сіла прыкладу, сіла нагляднага пераканання. Неабходна знаходзіць усюды расткі новых, комуністычных адносін да працы, да соцыялістычнай уласнасці, узоры патрыятызма пры абароне свяшчэнных граніц нашай радзімы і выхоўваць на іх працоўных. Выхаванне працоўных на станоўчых прыкладах і ўзорах ёсць самы дзейсны і адзіна правільны метад выхавання.

Выхаванне людзей у нашых умовах, тым больш выхаванне іх у комуністычным духу, — крайне складаная палітычная задача. У гэтай справе патрабуецца строга індывідуальны падыход. Адзін чалавек не падобен на другога. Недахопы і парокі аднаго не падобны на недахопы і парокі другога. Выхаванне патрабуе ўчоту гэтых асаблівасцей. А для таго, каб такі падыход выпрацаваць, трэба ведаць людзей, ведаць іх ва ўсіх адносінах: ведаць іх акружэнне, ведаць іх бытавыя ўмовы, ведаць іх запросы і патрэбы і т. д.

У справе комуністычнага выхавання працоўных выключную ролю адыгрывае партыя Леніна—Сталіна—перадавы атрад рабочага класа і перадавы атрад працоўных у іх барацьбе за ўмацаванне і развіццё соцыялістычнага ладу. Асобая кіруючая роля партыі ў комуністычным выхаванні працоўных патрабуе паслядоўнай барацьбы з перажыткамі капіталізма ў сазнанні членаў партыі.

«Калі некаторыя думаюць, што пераробка сазнання людзей не датычыць членаў партыі, што комуністы ад параджэння свабодны ад усякіх прадрассудкаў і абсалютна не маюць патрэбы ні ў якім перавыхаванні, то гэта ні што іншае, як ідэалістычны, схематычны погляд на людзей» (Жданаў, даклад на XVIII з'ездзе партыі).

Комуністычным выхаваннем павінны займацца пад кіраўніцтвам партыі, пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый усе совецкія, профсаюзныя, кааператыўныя, комсамольскія і іншыя масавыя арганізацыі працоўных. Кожная з гэтых арганізацый павінна паставіць у гэтай справе пасільную задачу і сістэматычна яе ажыццяўляць. Толькі агульнымі намаганнямі, накіраванымі да дасягнення адной агульнай мэты — да перамогі комунізма, можна па-большэвіцку ажыццявіць комуністычнае выхаванне працоўных і ажыццявіць пераход ад соцыялізма да комунізма.

Ф. КОШЭЛЕЎ.

Да 80-годдзя са дня нараджэння Шолам-Алейхема

ВЯЛІКІ ЯЎРЭЙСКІ ПІСЬМЕННІК

* * *

ЛЮБІМЫ ПІСЬМЕННІК

Мне ўспамінаецца такі выпадак. Гэта было даўно, у цёмны і пракляты час царызма. Аднаго разу вечарам сабраліся мы на чарговую чытку. Чыталі мы Шолам-Алейхема. Да нас прыходзілі і з суседніх дамоў. Мне было тады 10 год, але я ўжо лічыўся дарослым. Я ведаў усе «прэлесці» жыцця, босы і абарваны, я бачыў наўкола сябе беднасць, галечу. Хлеб у нашым доме быў не пастаянным жыхаром, а аб астатнім і гаварыць не прыходзіцца.

У гэты вечар сабралося асабліва многа народу. Адзін мой таварыш пачаў чытку. Мы сядзелі вакол стала і ўважліва слухалі прыгоды хлопчыка Мотла. Мы ўходзілі ў думках у нейкі новы свет, свет перажыванняў і вялікіх пачуццяў.

Я не заўважыў, як да мяне падышла маці, паклала мне рукі на плечы і сказала:

— Чаго ты, Абраша, плачаш?

— Хіба я плачу? — са здзіўленнем, падняўшы вочы на маці, спытаў я. — Я не плачу. Я-ж смяюся. З чаго ты ўзяла, што я плачу?

— Але твой твар увесь у слязах.

І сапраўды, твар у мяне быў смяючыйся, а з вачэй ліліся слёзы.

Гэта быў смех скрозь слёзы. Так я ўспрыймаў творы вялікага і любімага пісьменніка. Чытка яго твораў, асветленых сонечным юмарам, была для нас сапраўдным святам. Ён умеў апісваць жыццё такім, якім яно ёсць. Ён добра ведаў народ, яго гора, яго слёзы, яго веру ў лепшую будучыню. Ён асмейваў вострым словам мастака ўсё мярзотнае, дрэннае, ганебнае, што ёсць на зямлі.

Колькі я перажываў, чытаючы пра лёс Тэв'е-малочніка, гэтага героя шолам-алейхемаўскіх твораў. Народны мудрэц, чалавек, на якога «ўсе шышкі валіліся», якога спатыкала адна бяда за другой, — Тэв'е ніколі не падаў духам, ніколі не ўнываў. І нават, калі па загаду цара Нікалая Тэв'е быў выгнан з насіджанага месца, ён не апусціў галаву. Ён успомніў словы дачкі Голд, прысланыя ў пісьме з далёкай Сібіры, што настане другі час, сонца ўзыйдзе над краінай і людзі пачнуць жыць радасна і шчасліва.

Лёс Тэв'е-малочніка — гэта быў лёс працоўных яўрэяў у часы царызма. Пагромы, «процантная норма», «чарта аседласці»—колькі гора і прыніжэння цярпеў яўрэйскі працоўны народ! І аб гэтым так красачна і праўдзіва пісаў Шолам-Алейхем.

Цяпер мы жывем у новы час. Сонца шчаслівага жыцця заззяла над совецкай зямлёй. Партыя большэвікоў і совецкая ўлада забяспечылі працоўным яўрэям, як і ўсім народам нашай вялікай радзімы, светлае і раласнае жыццё. Перачытваючы зараз творы вялікага класіка яўрэйскай літаратуры, мы яшчэ больш усведамляем, як многа зрабіла партыя большэвікоў, якую гіганцкую работу яна правяла і якім пышным цветам расквітнела ленінска-сталінская нацыянальная палітыка.

У нашай соцыялістычнай радзіме чытаюць і любяць Шолам-Алейхема. Ён дарагі нам як сапраўдны народны пісьменнік, які любіў жыццё і народ. Ён сам вышаў з народа, гаварыў моваю народа і тварыў для народа. І таму народ яго любіць.

А. М. ЦЭЙТЛІН,
стаханавец менскай абутковай фабрыкі імені Кагановіча.



ЁН ЛЮБІЎ СВОЙ НАРОД

У адным з сваіх выказванняў аб літаратуры Шолам-Алейхем піша: «Народны пісьменнік, мастак, паэт павінен быць для свайго часу, для сваёй эпохі, для сваіх год люстрай, у якой адбіваюцца праменні жыцця, як у чыстай крыніцы вады праменні светлага сонца». І далей у другім месцы: «Калі пішаш для народа і гаворыш з ім на яго мове, трэба даць яму такія вобразы і карціны, якія яму добра вядомы, гэта значыць: героі павінны быць узяты з яго асяроддзя — з самога народа.

Хто ведае наш народ, той ведае, што герояў сярод народа значна больш, чым сярод вышэйшых класаў. Народ павінен ведаць, якімі сіламі ён уладае, якія рэдкія людзі валяюцца ў яго асяроддзі і ідуць, як гэта гавораць у «нівеч».

Гэтыя выдатныя выказванні вялікага яўрэйскага народнага пісьменніка сапраўды як у люстры паказваюць нам жыццё і творчасць Шолам-Алейхема. Кожная мысль, кожнае слова гэтага геніяльнага чалавека да апошніх дзён яго жыцця, да апошняй кроплі былі самым мацнейшым і шчырым чынам звязаны з народам. У народзе і толькі ў народзе, у гэтай невычарпальнай крыніцы вялікі пісьменнік чэрпаў поўнай чашай вялікую сілу, бяссмертную сілу сваіх твораў, сваіх герояў. Чытаючы творы Шолам-Алейхема, бачыш, з якой любоўю, з якой увагай і сапраўды брацкім спачуваннем адносіўся Шолам-Алейхем да свайго народа. Ні адна старана жыцця, ні адно няшчасце гэтага народа не асталося па-за полем зроку пісьменніка. У творах Шолам-Алейхема, як пражэктарам, асветлены ўсе цёмныя, няўзрачныя закавулкі жыцця яўрэяў у царскай Расіі. З якой сілай Шолам-Алейхем паказаў нам, яго чытачам, вялікую трагедыю народных таленстаў таго часу. Які трагічны лёс Стэмпеню, герояў «Блуждающих звезд» і інш.

Чытаючы Шолам-Алейхема, кожны з нас, совецкіх пісьменнікаў, яшчэ вастрэй адчувае, у якім вялікім даўгу мы яшчэ перад нашай радзімай, перад нашым совецкім народам. Мы яшчэ да сёнешняга дня не пачалі паказваць народу тых выдатных людзей, тых народных герояў, выхадцаў з самай гушчы народных мас, якімі так багата наша слаўная сонечная радзіма.

Юбілей Шолам-Алейхема яшчэ раз пакажа усяму свету, на якую вышыню ў нашым Совецкім Саюзе паднята культура, на якую недаступную для капіталістычнага свету вышыню паднята ў нас наша многанацыянальная літаратура. Творы геніяльнага пісьменніка — класіка яўрэйскай літаратуры перакладзены амаль на ўсе мовы народаў нашай неасяжнай радзімы. Кнігі Шолам-Алейхема сталі настольнымі кнігамі не толькі яўрэйскага народа, але і другіх народаў СССР. Творы Шолам-Алейхема нямала дапамаглі ў справе ўмацавання дружбы яўрэйскага народа з усім многамільённым народам нашага Саюза.

Такі юбілей, як юбілей Шолам-Алейхема, магчымы толькі ў краіне перамогшага соцыялізма, толькі ў краіне, якая з'яўляецца айчынай для ўсіх працоўных, у краіне, дзе народ, скінуўшы з сябе вечнае ярмо няволі, атрымаў найшырэйшы доступ да скарбніц вялікай сусветнай літаратуры, культуры і навукі, у краіне, дзе ўсе народы адчуваюць пітодзенна вялікую любоў, клопаты і бацькоўскую ўвагу да сябе з боку нашага роднага таварыша Сталіна.

Сара КАГАН.

ПІСЬМЫ ДА ШОЛАМ-АЛЕЙХЕМА

Шчыра паважаны сабрат Шолам-Алейхем!

Кнігу Вашу атрымаў, прачытаў, смяяўся і плакаў — цудоўная кніга! Пераклад, мне здаецца, зроблен умела і з любоўю да аўтара, хаця месцамі адчуваецца, што на рускай мове трудна перадаць сумны і сардэчны юмар арыгінала. Кажу—адчуваецца. Кніга мне моцна падабаецца — яшчэ раз скажу — выдатная кніга! Уся яна іскрыцца такой слаўнай, дабротнай і мудрай любоўю да народа, а гэта пачуццё так рэдка ў нашы дні.

Шчыра жадаю Вашай кнізе поспеху, — не сумнявайцеся ў ім. Моцна паціскаю руку.

М. ГОРКІ.

* * *

Гэтае пісьмо А. М. Горкага да Шолам-Алейхема напісана было 21 красавіка 1910 года з поваду першага рускага перакладу кнігі «Хлопчык Мотл», выданай пад назвай «Дзеці чарты».

— —

Саламон Наумавіч!

Жудаснае ўтворанае ў Кішанёве зладзейства хваравіта здзівіла мяне. Я выказаў часткова мае адносіны да гэтай справы ў пісьме да знаёмага яўрэя, копію з якога прыкладаю. Днямі мы з Масквы паслалі калектыўнае пісьмо кішанёўскаму галаве, якое выказвае нашы пачуцці з выпадку гэтай жудаснай справы.

Я вельмі рад буду садзейнічаць вашаму зборніку і пастараюся напісаць штонебудзь адпавядаючае акалічнасцям. На жаль, тое, што я маю сказаць, а іменна, што віноўнік не толькі кішанёўскіх жудасцей, але ўсяго таго разладу, які пасяляецца ў некаторай малой частцы—і не народнай — рускага насельніцтва—адзін урад,—на жаль, тое я не магу сказаць у рускім друкаваным выданні.

ЛЕЎ ТАЛСТОЙ.

* * *

Пісьмо Талстога да Шолам-Алейхема напісана 6 мая 1903 года ў сувязі з наступнымі акалічнасцямі: у гэтым годзе царскі ўрад арганізаваў у Кішанёве жудасны яўрэйскі пагром. Група яўрэйскіх пісьменнікаў рашыла выдаць літаратурны зборнік у дапамогу пацярпеўшым ад пагрому. Шолам-Алейхем звярнуўся з просьбай да Л. Н. Талстога прысласць што-небудзь для зборніка. Талстой прыслаў тры казкі, якія ў перакладзе Шолам-Алейхема былі надрукаваны ў зборніку, і публікуемае намі пісьмо.

„ЗАПІСКІ КОМІВАЯЖОРА" ШОЛАМ-АЛЕЙХЕМА НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Да 80-годдзя з дня нараджэння вялікага класіка яўрэйскай літаратуры Шолам-Алейхема Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі (аддзел мастацкай літаратуры) выдала вядомы твор пісьменніка «Запіскі комівяжора» на беларускай мове.

«Запіскі комівяжора» — гэта семнаццаць цікавых апавяданняў.

Пераклад гэтых апавяданняў добра зроблен беларускім пісьменнікам-ордэнаносцам Змітраком Бядуляй. Кніжка выйшла тыражом у 6 тыс. экземпляраў, з добрай вокладкай і каштуе 3 рублі.

Беларускі чытач з задаволеннем прачытае цікавыя апавяданні вялікага пісьменніка на сваёй роднай мове.

* * *

БЕССМЯРОТНЫ ШОЛАМ-АЛЕЙХЕМ

Шолам-алейхем азначае: Мір вам! Сардэчнае прывітанне!

Шчырае гарачае прывітанне прыносіла ва ўбогія хаціны яўрэйскіх працоўных мас кожная кніжка і кніжачка любімага яўрэйскага класіка Шолам-Алейхема. Ён з'яўляўся жаданым госцем, родным, свойскім чалавекам.

Гэта было ў канцы XIX і ў пачатку XX стагоддзяў. У той час усе народы былой царскай Расіі цярпелі надзвычайны здзек. Аднак пакуты яўрэйскіх працоўных мас не паддаюцца апісанню.

Яўрэйскі народ, які нідзе не меў сваёй уласнай тэрыторыі, які не карыстаўся ніякімі чалавечымі правамі, якога царскі ўрад ганьбіў і фізічна і маральна рознымі жудаснымі ўчынкамі, жыў тады ў своеасаблівым канцлагеры.

Кожны шолам-алейхемскі твор быў сонечным праменем у цёмным жыцці народа. Яго чытала літаральна ўсё працоўнае яўрэйскае насельніцтва: рознастайныя рамеснікі, балаголы, прадаўшчыцы абаранкаў і гатаванага бобу, служанкі і прыказчыкі ў багатых крамнікаў, купецкія фурманы, дзеці з хедэра і дробная буржуазія. Кожны з чытачоў знаходзіў у творах Шолам-Алейхема пра сябе, пра сваё жыццё.

Вялікі класік яўрэйскага народа пісаў для самых шырокіх мас. У яго сэрцы гарэла, нібы вечны агонь, замілаванне да беднаты. Ён аддаваў ёй увесь свой вялікі талент.

Для малявання жыцця народа ён ужываў самыя яркія фарбы, цудоўную мову, дзе кожны радок — перлы народнай мудрасці, дзе кожны радок — мілагучная музыка, дзе кожны радок — смех і плач, злучаныя ў адно.

Народ бачыў у творах замілаванага пісьменніка сваю векавечную нядолю, свае мары аб лепшым жыцці, аб светлай будучыні. Шолам-Алейхем будзіў у народных мас веру ў іх уласныя сілы, выпястоўваў і расціў у народным сэрцы зганьбаваны сваімі эксплаататарамі і царскім чыноўніцтвам народны гонар, гордасць і чалавечую чэсць.

У тыя годы цяжка было яўрэйскаму народу жыць — цяжка было яўрэйскаму пісьменніку тварыць.

У той час было нямала яўрэйскіх пісьменнікаў розных лагераў і напрамкаў.

Адны з іх пісалі салодка-сантыментальныя слёзныя творы, плакалі над горам народным, галасілі над вечным пакутнікам, але не будзілі ў ім бадзёрасці, не ўзмацнялі яго надзеі аб лепшых часах.

Другія з іх шукалі выратавання народа ў шавіністычным аб'еднанні яго са сваімі эксплаататарамі і духавенствам, у адрыве ад іншых народаў.

Трэція баламуцілі народ прыгонніцкай балбатнёй — байкамі аб графах і графінях, баронах і баранесах, аб яўрэях-прыслужніках у гэтых графаў і баронаў, аб яўрэях, што самі зрабіліся графамі і баронамі і т. д.

А калі былі да прыходу Шолам-Алейхема пісьменнікі з эпохі «Гаскола» (Асвета), якія клікалі народ да змагання з клерыкалізмам, дык тыя звярталіся толькі да яўрэйскай буржуазіі (Перац Смаленскі, Я. Л. Гардон і інш.). Яны, між іншым, пісалі выключна на стара-яўрэйскай мове, недаступнай для шырокіх народных мас.

У той час жывая яўрэйская мова была не ў пашане ў буржуазіі як мова «амгарацім» (простых грубых людзей).

Яўрэйская літаратура ў той час нагадвала мёртвую пустэчу. Мільённыя масы народа адчувалі голад і смагу па жывому мастацкаму слову. Краўцы, шаўцы, балаголы і іншыя слаі з «нізоў» тварылі сваю вусную літаратуру — песні і казкі, у якіх яны высмейвалі духавенства і багачоў, у якіх яны апявалі сваю нядолю.

У мёртвых пясках яўрэйскай літаратуры першую жывую крыніцу выкапаў старэйшы класік яе Мендэль Мойхер-Сфорым. А за ім творчасць Шолам-Алейхема, нібы веснавая паводка, змыла мёртвыя пяскі і ажывіла грунт.

Былая пустэча пакрылася лугамі, на ёй выраслі лясы, над ёю заспявалі птушкі. Закіпела новае літаратурнае жыццё.

Шолам-Алейхему прыходзілася аддаваць шмат энергіі, каб ачысціць гнілую атмасферу літаратуршчыны. Супроць яго выступала духавенства, буржуазія.

Аднак перамагло цудоўнае шолам-алейхемскае пяро, перамог яго яркі талент.

Шолам-Алейхем чэрпаў натхненне з гушчы народных мас, з іх шматграннага тыпажа, з іх векавечнай мудрасці, з іх сонечнага юмару, з іх яркай жывой мовы, якая звініць, як струна, і блішчыць, як перлы.

Шолам-Алейхем жыў марамі і надзеямі народа, пакутваў яго пакутамі, радаваўся яго радасцямі. Ён любіў тое, што любіць народ і ненавідзеў тых, каго ненавідзіць народ. Вялікі пісьменнік апяваў працоўнага чалавека ад яго нараджэння да яго апошніх дзён. Бадай трэцюю частку сваёй творчасці Шолам-Алейхем аддае дзецям. Апісвае з замілаваннем іх радасці і смутак. З усёй жудасцю ён паказвае хедар, дзе калечыліся дзеці яўрэйскай беднаты. Ён апісвае цягу да мастацтва ў яўрэйскіх дзяцей і дарослых, цягу да розных навук, якія ў той час былі недаступны народным масам.

Каб усцешыць народ у яго несупынным горы, Шолам-Алейхем трапна наігрываў на залатой ліры народнага сэрца. Ён бадзёрыць народ смехам.

«Смяяцца карысна, дактары раюць смяяцца» — гаварыў Шолам-Алейхем. Смяяцца над сваім горам, над сваімі няўдачамі ўжо ёсць моцны ўдар, пачатак перамогі над бядою. Смяюцца дзесяткі і сотні герояў шолам-алейхемаўскіх твораў, смяюцца сотні тысяч яго чытачоў.

Гэта іх бадзёрыць. У яго творах яны бачаць саміх сябе, як ў люстэрцы — і смяюцца, смяюцца... Смех узмацняў людзей, хаця часам гэты смех бываў больш трагічным за плач і слёзы...

Рэволюцыйны рух ахопліваў усю Расію, у гэты рух уключаліся з даўніх часоў і яўрэйскія працоўныя гарадоў і мястэчак «чарты аседласці». Яны навучыліся змагацца і перамагаць. Яны зрабіліся героямі.

Калі-б Шолам-Алейхем дажыў да нашых дзён, ён пабачыў-бы, што лепшыя надзеі і мары працоўных мас яўрэйскага народа, разам з надзеямі і марамі працоўных мас іншых народаў, спраўдзіліся ў жыцці.

Калі-б Шолам-Алейхем дажыў да нашых дзён, ён пабачыў-бы што Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя кінула ганебную эпоху царызма ў нябыт, што дзякуючы роднай партыі Леніна—Сталіна яўрэйскі народ у вялікім Совецкім Саюзе жыве поўнакроўным жыццём, як усе іншыя народы, прыгнечаныя пры самадзяржаўі.

Калі-б Шолам-Алейхем дажыў да нашых дзён, ён пабачыў-бы, што героі яго твораў жывуць новым шчаслівым жыццём, што яго кнігі чытаюць на сваіх родных мовах усе народы нашага вялікага Саюза. Ён пабачыў-бы, што яго новыя чытачы захапляюцца яго вялікім мастацтвам, смяюцца і плачуць над лёсам яго герояў, якія беззваротна адышлі ў мінулае.

ЗМІТРОК БЯДУЛЯ.

ШОЛАМ-АЛЕЙХЕМ

Усе народы нашай соцыялістычнай краіны адзначаюць 80-годдзе з дня нараджэння вялікага яўрэйскага пісьменніка, класіка яўрэйскай літаратуры — Шолам-Алейхема, якога А. М. Горкі называў «выключна таленавітым сатырыкам і юмарыстам».

З іменем Шолам-Алейхема звязана цэлая паласа ў жыцці яўрэйскага народа. Пачаўшы сваю літаратурную работу ў 80-х годах мінулага стагоддзя, у годы жорсткай палітычнай рэакцыі, Шолам-Алейхем з велізарнай глыбінёй паказаў жыццё яўрэйскіх народных мас, стагнаўшых пад падвоеным гнётам капіталістычнай эксплаатацыі і царскага свавольля. Сваім вострым пісьменніцкім чуццём Шолам-Алейхем улаўліваў змяненні ў грамадскім жыцці. У яго творчасці адлюстраваны ўсе важнейшыя грамадскія працэсы перадрэволюцыйнага перыяду — аж да сусветнай імперыялістычнай вайны (Шолам-Алейхем памёр у 1916 годзе). З вялікім інтарэсам і глыбокай сімпатыяй Шолам-Алейхем наглядаў і мастацкі адлюстроўваў прабуджэнне народных сіл у час першай рускай рэволюцыі 1905 года.

Шолам-Алейхем (сапраўднае яго імя — Шолам Рабіновіч) нарадзіўся ў 1859 годзе на Украіне. Ён рана пазнаў галечу. Ён рана адчуў таксама на сабе ўсе тыя абмежаванні ў правах і праследваннi, якім царскі ўрад падвяргаў яўрэяў. Яўрэйскае насельніцтва было скучана ў некалькіх губерніях, у так званай «чарце аседласці»; ва ўсіх астатніх частках велізарнай краіны яўрэі не мелі «праважыхарства». Гэтыя і іншыя штучныя меры царскага ўрада яшчэ больш узмацнялі галечу яўрэйскіх народных мас і пазбаўлялі іх элементарных чалавечых правоў.

Вялома, яўрэйская буржуазія лёгка абыходзіла драконаўскія меры царскага ўрада, сваім астрыём накіраваныя супроць яўрэяў-беднякоў, загнаных у «чарту аседласці», пазбаўленых права займацца земляробствам і магчымасці працаваць на буйных прамысловых прадпрыемствах, размешчаных за «чартой».

Шолам-Алейхем вельмі добра ведаў жыццё яўрэйскай беднаты, і жыццё гэта ў самых рознастайных яго праяўленнях ён жыва апісаў у сваіх выдатнейшых апавяданнях і аповесцях, якія набылі велізарную папулярнасць.

Шолам-Алейхем быў народны пісьменнік у самым сапраўдным значэнні гэтага слова. Блізасць да народа сказваецца ўжо ў самім літаратурным псеўдоніме пісьменніка: «шолам-алейхем» значыць па-руску «мір вам», «добры дзень»; гэта было звычайнае прывітанне ў старым яўрэйскім быце. Ужо самое імя пісьменніка гучэла, як слова прывітання. І сапраўды, яўрэйскія народныя масы сустрэлі Шолам-Алейхема як свайго, як блізкага чалавека, з якім можна і запроста пажартаваць і падзяліцца сваім смуткам і горам.

У жыцці Шолам-Алейхема былі вельмі цяжкія перыяды: годы цяжкай хваробы і матэрыяльных пакут, годы вымушанай разлукі з радзімай (хвароба прымушала яго шукаць месца пад сонцам паўднёвых краін). Але і ў самыя цяжкія моманты яго не пакідала пачуццё найглыбейшай прывязанасці да народных мас, дзеля якіх ён жыў і тварыў, і гэта пачуццё ўсяляла ў ім веру ў перамогу і таржаство народнай справы.

Блізасць Шолам-Алейхема да народа знайшла яркае выражэнне і ў чуллівых словах яго завяшчання: «Дзе-б я ні памёр, няхай мяне пахаваюць не сярод арыстакратаў, людзей знаці або багачоў, а сярод простых яўрэяў, рабочых, з сапраўдным народам, каб помнік, які потым паставяць на маёй магіле, упрыгожваў простыя магілы вакол мяне, а простыя магілы, каб упрыгожвалі мой помнік, як просты чэсны народ пры маім жыцці ўпрыгожваў свайго народнага пісьменніка».

Своеасаблівасць Шолам-Алейхема як пісьменніка заключаецца ў яго юмары. Жыццё, аб якім Шолам-Алейхем расказваў, было ўбогае і сумнае; яго «героі», жыхары Касрылаўкі, жылі ўпрогладзь, не ведаючы радасці і не бачачы святла. Але Шолам-Алейхем стварыў выдатныя вобразы «вясёлых беднякоў», якія заўсёды ўмеюць жартам расцвеціць акружаючае ўбогае жыццё. Шолам-алейхемаўскі юмар не скрывае таго глыбокага трагізма, які тоіцца ў жыцці прыгнечаных і прыцясненых народных мас, але ён нібы акрыляе абяздоленых надзеяй на вызваленне і пазбаўленне ад акоў. І хаця шолам-алейхемаўскі смех перамешваецца часта з глыбокай горыччу, ён увасабляе ў сабе той стыхійны, заўсёды жывы аптымізм, які сваімі карэннямі далёка ўходзіць у народную глыбіню.

Пакаленне пісьменнікаў 60-х гадоў, прыпоўшых у яўрэйскую літаратуру да Шолам-Алейхема, і сярод іх выдатны класік Мендэле Мойхер-Сфорым, яшчэ застала жывучыя і цэпкія рэшткі сярэдневякоўя, якія трымалі ў сваім палоне і культуру яўрэйскага народа і яго быт. Увесь грамадскі пафас гэтага пісьменніцкага пакалення заключаўся ў барацьбе з перажыткамі сярэдневякоўя, за асвету, за еўрапеізацыю жыцця і ўсіх бытавых адносін.

К таму часу, калі прышоў у літаратуру Шолам-Алейхем, яўрэйскае жыццё перанярпела велізарныя сацыяльныя змяненні. Новыя капіталістычныя адносіны шырока развіваліся па ўсёй краіне, і яны дакаціліся таксама да старога яўрэйскага мястэчка, жыўшага раней абасобленым, замкнутым жыццём. Старое яўрэйскае мястэчка заварушылася, як муравейнік, і яго жыхары пачалі шукаць сабе месца ў новым распарадку эканамічных адносін. Гэта быў вельмі хваравіты працэс. Умовы царскага гнёту і нацыянальных абмежаванняў яшчэ больш абвастралі і ўскладнялі гэты працэс.

У многіх сваіх выдатных творах Шолам-Алейхем паказаў сустрэчу старага местачковага жыхара з новым капіталістычным светам і трагічны лёс мястэчка ў новай абстаноўцы капіталістычнай эксплаатацыі. Сярод твораў Шолам-Алейхема, прысвечаных гэтай тэме, асабліва выдзяляецца цыкл апавяданняў «Менахем-Мендэль» (па імені іх галоўнай дзеючай асобы). Знешнія рухі гэтага чалавека, яго бяссэнсавая мітусня, яго дон-кіхоцкія фантастычныя праекты, пастаянная незадачлівасць выклікаюць у чытача смех, але ў сапраўднасці жыццё Менахем-Мендэля глыбока трагічна. Гэта «чалавек паветра», у якога няма глыбокіх карэняў у глебе; гістарычныя ўмовы яго існавання абдзялілі яго, у яго няма прадоўных навыкаў, няма той стойкасці і пропідзеяння, якія вырастаюць у працоўнага чалавека. Капіталістычная машына бязлітасна размалвае Менахем-Мендэля.

Свайму трагікамічнаму герою Менахем-Мендэлю Шолам-Алейхем пропістаўляе сапраўднага тружаніка, сапраўднага чалавека з народа, — Тэв'е-малочніка. Гэта—галоўная дзеючая асоба другога цыкла шолам-алейхемаўскіх апавяданняў, якія посяць яго імя («Тэв'е-малочнік»). Калі Менахем-Мендэль — «чалавек паветра», то Тэв'е—глыбока звязаны з роднай глебай, моцны, працавіты, поўны жыццёвых сокаў чалавек з народа. Жыццё ставіць перад ім цэлы рад выпрабаванняў, на яго сыплецца адно няшчасце за другім, але нішто не ў стане зламіць яго дух. Тэв'е-малочнік увасабляе ў сабе сапраўды народны аптымізм, сапраўды народную жыццёвую сілу, якая захоўвае ў вяках сваю бессмяротнасць.

Шолам-Алейхем паказвае, як Тэв'е-малочнік, вырасшы ў старым быту і захаваўшы яшчэ патрыярхальныя ўяўленні, уцягваецца ў новае жыццё і пачынае ўсведамляць акружаючую соцыяльную несправядлівасць. Дзеянне асобных апавяданняў з цыкла «Тэв'е-малочнік» разгортваецца ў поўныя велічы годы першай рускай рэволюцыі 1905 года. Адна з дочак Тэв'е ўходзіць у ссылку са сваім мужам-рэволюцыянерам — у далёкую Сібір. Пераўтвараючая атмасфера рэволюцыі адчуваецца вакол Тэв'е-малочніка.

Шолам-Алейхем заўсёды быў на старане эксплаатыруемых і прыгнечаных народных мас. Яшчэ ў 80-х годах мінулага стагоддзя, у пачатку свайго літаратурнага шляху, Шолам-Алейхем выступіў з сатырычным раманам «Сендэр Бланк», накіраваным супроць сямейнага быту яўрэйскіх багачоў, супроць яўрэйскіх Кіт Кітычаў. У 90-х годах Шолам-Алейхем напісаў камедыю «Якнегоз», рэзка абліччаючую біржавых дзяльцоў. З пагардай гаворыць заўсёды аб багацеях любімы герой Шолам-Алейхема — Тэв'е-малочнік. Ад яго жартаў вельмі солана прыходзілася і госпаду богу.

Шолам-Алейхем рысуе працэс соцыяльнага прасвятлення народных мас. Прасякнутыя сапраўды дэмакратычным гуманізмам, апавяданні Шолам-Алейхема аб Тэв'е-малочніку вырастаюць у глыбока паэтычную паэму, поўную соцыяльнага сэнсу і філасофскіх раздум'яў, паэму аб чалавечым жыцці, аб прыродзе, аб бацькоўстве і мацярынстве, аб непагасным імкненні чалавека да шчасця. І ён заўсёды, у Шолам-Алейхема глыбокі трагізм палажэнняў пранізан светлымі праменнямі народнага аптымізма, які знаходзіць сваё выражэнне ў прыгожым і непаўтарымым шолам-алейхемаўскім юмары.

А. М. Горкі назваў юмар Шолам-Алейхема «сумным і сардэчным». Горкі пісаў аб «слаўнай, дабротнай і мудрай любві да народа», якая прасякае ўсю творчасць Шолам-Алейхема. Гэта «мудрая любоў да народа» сказваецца ва ўсіх кнігах Шолам-Алейхема. З асаблівай сілай яна свеціцца ў тых яго творах, якія прысвечаны паказу дзяцей. Тут на першым месцы трэба паставіць цудоўную аповесць «Хлопчык Мотл». У дзіцячай душы, якая шырока адкрываецца насустрач сонцу і прыгожасці жыцця, вялікі пісьменнік-гуманіст бачыў правобраз народа. З вялікай любоўю Шолам-Алейхем рысаваў таксама таленавітых людзей, непасрэдна вышаўшых з народа. Тэме народных талентаў і іх сумнаму лёсу ва ўмовах прыгнятага царызма прысвечаны яго раманы «Стэмпеню», «Іоселе-Салавей», «Блукаючыя зоры».

У смешных гісторыях Шолам-Алейхема шмат глыбокага суму. У яго «смеху скрозь слёзы» гучэла горкае асуджэнне ладу, які грунтаваўся на эксплаатацыі чалавека чалавекам. У той-жа час вялікі пісьменнік клікаў да новага, лепшага жыцця.

Не гледзячы на ўсю нацыянальную своеасаблівасць і таго жыцця, якое Шолам-Алейхем рысуе, і яго мовы, і самога яго юмару, Шолам-Алейхем належыць не толькі яўрэйскай літаратуры. Глыбокі гуманізм, шырокі ахват жыцця, добрае веданне чалавека, тонкае пранікненне ў душу дзіцяці, сапраўдная народнасць і сапраўды народны аптымізм ставяць Шолам-Алейхема ў рады лепшых пісьменнікаў сусветнай літаратуры. Многімі ніцямі творчасць Шолам-Алейхема звязана з рускай літаратурай. Шолам-Алейхем рос і развіваўся пад моцным уздзеяннем вялікіх рускіх пісьменнікаў. Ён клікаў вучыцца прастаце ў Льва Талстога і Чэхава.

Аптымізм Шолам-Алейхема гістарычна апраўдаўся. Мы адчуваем пісьменніка зусім у іншай соцыяльнай абстаноўцы, чым тая, у якой ён жыў і тварыў. Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя змяла з твару нашай зямлі і цара, і капіталістаў, і памешчыкаў. У нашай цудоўнай краіне вастаржаставаў соцыялізм. А разам з ім расцвіла вялікая дружба народаў.

Шматпакутны яўрэйскі народ, на працягу тысячагодзяў не ведаўшы радзімы, знайшоў у СССР радзіму-маці. Разам з іншымі народамі вялікага многанацыянальнага Совецкага Саюза ён будуе шчаслівае соцыялістычнае жыццё, якое аберагае вялікая Сталінская Канстытуцыя. І ў той час, як у краінах, якія тамяцца пад пятой фашызма, ашалелыя людаеды топяць сваё шаленства ў крыві працоўнага яўрэйскага насельніцтва, уся наша краіна святкуе юбілей вялікага яўрэйскага пісьменніка, чыё імя стала блізка і дорага ўсім вызваленым народам адзінай совецкай сям'і.

А. ГУРШТЭЙН.

ДЭКЛАРАЦЫЯ ФРАНЦУЗСКАГА ЎРАДА

ПАРЫЖ, 13 красавіка. (ТАСС). Сёння апублікавана дэкларацыя, прынятая на ўчарашнім пасяджэнні ўрада. Аглашаючы гэтую дэкларацыю, глава ўрада Далад'е заявіў, што ў сувязі з трывожнай абстаноўкай урад Францыі прыняў ваенныя меры, «якія гарантыруюць супроць усіх вы падковасцей французскія граніцы і Французскую імперыю» і прадаўжае дыпламатычныя перагаворы з радам краін.

У дэкларацыі адзначаецца, што французскі ўрад «надае самае вялікае значэнне папярэджанню ўсякіх змен існуючага становішча ў Міжземным моры і на Балканскім поўвостраве з дапамогай сілы або з дапамогай пагрозы сілай».

Французскі ўрад, указваецца ў дэкларацыі, даў, у сувязі з падзеямі апошніх тыдняў, асобыя запэўненні Румыніі і Грэцыі ў тым, што «ў выпадку, калі-б былі прадпрыняты дзеянні, якія яўна пагражалі-б незалежнасці Румыніі або Грэцыі і ў адносінах якіх румынскі або грэчаскі ўрады лічылі-б, што ў іх жыццёвых інтарэсах аказаць супраціўленне сваімі нацыянальнымі сіламі, то французскі ўрад будзе лічыць сябе абавязаным неадкладна аказаць усялякую дапамогу наяўнымі ў яго распараджэнні сродкамі».

У дэкларацыі ўказваецца, што англійскі ўрад заняў тую-ж самую пазіцыю.

Падкрэсліўшы, што французскі ўрад вітае пагадненне паміж Англіяй і Польшчай, дэкларацыя ўказвае далей, што французскі і польскі ўрады пацвердзілі франка-польскі саюз і даюць узаемныя гарантыі на выпадак «прамой ці ўскоснай пагрозы, якая магла-б закрануць іх жыццёвыя інтарэсы».

— Нашы паслы, — указваецца ў заключэнне ў дэкларацыі, — паведамяць яе ўсім зацікаўленым урадам і, у прыватнасці, Турцыі.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАІ

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ КІТАІ

На паўднёвы захад ад Наньчана прадаўжаюцца баі ў раёне Гаоаня, каля якога кітайскія часці занялі важны горны праход. Японскія часці, якія праніклі ў горы, аказаліся адрэзанымі ад сваіх баз.

Кітайскія часці выбілі японцаў з ваколіц Уніна і атакуюць горад.

На поўначы ад Ханькоу баі ідуць за 80 кілометраў на захад ад Сіньяна. Японскія часці, якія перабраліся на заходні бераг ракі Хань, поўнасцю рассеяны. Японскі гарнізон, засеўшы ў Чжунсяне, акружан кітайскімі часцямі. У баях вакол Чжунсяна за апошнія тры дні японцы страцілі звыш 500 чалавек забітымі.

У ПАУДНЁВЫМ КІТАІ

9 красавіка пасля жорсткага бою кітайскія войскі занялі Хуасянь (на поўнач ад Кантона). Кітайскія войскі прадаўжаюць прасоўвацца на поўдзень к Кантону.

Па вестках кітайскіх газет, нядаўна каля Цунхуа (на паўночны ўсход ад Кантона) кітайскія часці разграмілі двухтысячны японскі атрад.

11 красавіка кітайская авіяцыя бамбардыравала японскія пазіцыі ў Цзянмыне (на паўднёвы захад ад Кантона). Знішчана пяць японскіх бронемашын.

ІТАЛЬЯНСКІ КАРОЛЬ ПРЫНЯЎ АЛБАНСКУЮ КАРОНУ

РЫМ, 14 красавіка. (ТАСС). Агенцтва Стэфані паведамляе, што італьянскі ўрад прыняў закон, па якому «італьянскі король прымае албанскую карону».

Да акупацыі італьянцамі Албаніі. НА ЗДЫМКУ: албанскія сяляне на вуліцы Тіраны. (Фотахроніка ТАСС).

ПРАДСТАЯЧЫЯ МАНЕЎРЫ ГЕРМАНСКАГА ФЛОТА

ПАРЫЖ, 14 красавіка. (ТАСС). Як перадае лонданскі карэспандэнт агенцтва Гавас, германскі ўрад паведаміў англійскі і французскі ўрады, што адбываючыяся штогод манёўры германскага флота будуць праведзены ў гэтым годзе ля ўзбярэжжа Іспаніі і прадоўжацца каля месяца.

Газета «Пці парыз'ен» піша, што Германія адказала на франка-англійскую ініцыятыву знамянальным жэстам. Яна папярэдзіла ўрады Лондана і Парыжа, што адна з германскіх эскадр адправіцца ў плаванне ля іспанскіх берагоў Атлантычнага акіяна. Гэта германская эскадра ўключае некалькі найбольш буйных адзінак германскага флота. Такім чынам, мае месца спроба прыцягнуць да Гібралтара судны англійскага флота, адпраўленыя ва ўсходнюю частку Міжземнага мора, і тым самым аблягчыць марскую пазіцыю Італіі. Гэтая дэманстрацыя прадстаўляе сабой таксама красамоўнае падтрыманне некаторых патрабаванняў генерала Франко. «Гэта— жэст настолькі-ж дзёрскі, наколькі і несцярожны, бо англічане не жартуюць з Гібралтарам, і Францыя не пацерпіць ніякіх падкопаў у адносінах Паўночнай Афрыкі».

КАНЦЭНТРАЦЫЯ ГЕРМАНСКІХ ВОЙСК НА ПОЛЬСКАЙ ГРАНІЦЫ

ЛОНДАН, 15 красавіка. (ТАСС). Паводле паведамлення варшаўскага карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс, германскія войскі сканцэнтраваны ўздоўж польскай граніцы ў раёне гарадоў Лауенбург і Шнейдэмюль, а таксама ў Сілезіі. Па словах карэспандэнта, польскі ўрад прызваў рэзервістаў трох узростаў.

ГАСТРОЛЬНАЯ ПАЕЗДКА СОВЕЦКІХ МУЗЫКАНТАЎ У ЗША

У сувязі з міжнароднай выстаўкай, якая адкрываецца ў Нью-Ёрку, Камітэт па справах мастацтваў пры Соўнаркоме СССР арганізуе вялікую гастрольную паездку маладых совецкіх музыкантаў у Злучаныя Штаты Амерыкі. У паездцы прымуць удзел лаўрэаты ўсесаюзных і міжнародных конкурсаў: скрыпачы — Давід Ойстрах, Ліза Гілельс, Марына Казалупава; піяністы — Эміль Гілельс, Якаў Фліер, Леў Аборын і віяланчэліст Даня Шафран. (ТАСС).

ВЫСТУПЛЕННЕ ЧЭМБЕРЛЕНА У АНГЛІЙСКІМ ПАРЛАМЕНЦЕ

ЛОНДАН, 13 красавіка. (ТАСС). Выступаючы сёння ў палаце абшчын, (англійскім парламенце) глава ўрада Чэмберлен спыніўся на захвапе Італіяй Албаніі.

«Грамадская думка ўсяго свету,— сказаў Чэмберлен, — яшчэ раз была глыбока патрасяна гэтай новай дэманстрацыяй выкарыстоўвання сілы. Ясна, заявіў Чэмберлен, што магутная дзяржава навязала сваю волю малай і безабароннай краіне праз прымяненне ўзброенай сілы.

Англійскі ўрад знаходзіць выключна трудным узгадніць усё тое, што адбылося ў Албаніі, з тым, што прадугледжвалася ў англа-італьянскім пагадненні. На карту пастаўлена не толькі будучае Албаніі. Пачуццё непакою і няўпэўненасці назіраецца не толькі ў сумежных з Албаніяй раёнах, але і ў другіх міжземнаморскіх дзяржавах і краінах Балканскага поўвострава».

Далей Чэмберлен заявіў, што «англійскі ўрад прышоў да заключэння, што ў выпадку якога-небудзь дзеяння, якое з несумненнасцю будзе пагражаць незалежнасці Грэцыі або Румыніі і якое грэчаскі або румынскі ўрады будуць лічыць настолькі закранаючым іх жыццёвыя інтарэсы, што яны будуць вымушаны аказаць яму супраціўленне ўсімі сваімі нацыянальнымі сіламі, англійскі ўрад палічыў-бы сябе абавязаным неадкладна аказаць грэчаскаму або румынскаму ўрадам, у залежнасці ад выпадку, усё падтрыманне, якое будзе ў яго сілах».

«Што датычыць мяне, — заявіў Чэмберлен,—то ўсё, што адбылося, не пахіснула майго пераканання, што палітыка ўрада, якая выразілася ў падпісанні англа-італьянскага пагаднення год таму назад, была правільнай. (Апладысменты на ўрадавых лавах і крыкі абурэння на лавах апазіцыі). Я заяўляю аб гэтым не для таго, каб выклікаць палеміку, але для таго, каб пазбегнуць няправільнага тлумачэння маёй пазіцыі ў даны час. Без сумнення, некаторыя заявяць, што мы павінны зараз парваць англа-італьянскае пагадненне, але я не падзяляю гэтага пункту гледжання».

СПРЭЧКІ Ў ПАЛАЦЕ АБШЧЫН

ЛОНДАН, 14 красавіка. (ТАСС). На ўчарашнім пасяджэнні палаты абшчын пасля Чэмберлена выступіў лідэр парламенцкай фракцыі лейбарыстаў Этлі, які заявіў, што ён расчараван заявай прэм'ера. Урад, заявіў ён, бачыў, як Албанія падверглася разбойніцкаму нападу з боку Італіі. Гэты акт з'яўляецца наўмысным нарушэннем абавязацельстваў, узятых на сябе Мусаліні ў адпаведнасці з англа-італьянскім пагадненнем. Лейбарысты заўсёды лічылі англа-італьянскае пагадненне рэзультатам памылковай і ненармальнай палітыкі «ўміратварэння». Гэты акт сведчыць аб тым, што немагчыма верыць словам правіцеляў Германіі і Італіі.

Этлі далей заявіў, што хоць ён вітае абавязацельствы англійскага ўрада ў адносінах Польшчы, Грэцыі і Румыніі, але тым не менш ён не бачыць ясных прызнакаў, якія сведчаць аб тым, што ўрад узяў новы курс у сваёй палітыцы.

Далей у спрэчках выступіў лідэр лібералаў Сінклер, які заявіў, што захват Албаніі як акт непрыкрытай агрэсіі не пакідае камня на камні ад палітыкі «ўміратварэння».

Сінклер патрабаваў, каб урад звярнуўся да Совецкага Саюза, Францыі, Турцыі, а, магчыма, таксама і да Румыніі, з пэўнымі прапановамі па пытанню аб дапамозе ў супраціўленні агрэсіі на Балканскім поўвостраве.

ПОМНІК В. І. ЛЕНІНУ

РАГАЧОЎ. (Спец. кар. «Звязды»). У дні святкавання Першага мая ў Рагачове адбудзецца ўрачыстае адкрыццё помніка геніяльнаму правадыру народаў В. І. Леніну. Помнік устанаўляецца ў гарадскім парку, сярод зелені і кветак. Пастамент ужо ўстаноўлен. У бліжэйшыя дні на ім узвысіцца скульптурная постаць В. І. Леніна ва ўвесь рост. Г. ГУБЛЕР.

ГОМЕЛЬ У ПЕРШАМАЙСКІЯ ДНІ

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). На ўсіх прадпрыемствах, ва ўстановах, на быўшых выбарчых участках Гомеля праводзяцца даклады і гутаркі, прысвечаныя першамайскаму святу. У дапамогу партарганізацыям для правядзення даклада ў і палітдзён вылучаны лепшыя прапагандысты горада.

У абласным Доме партыйнай асветы і ў клубах горада арганізуюцца выстаўкі на тэмы: «Вынікі двух сталінскіх пяцігодак і задачы трэцяй сталінскай пяцігодкі», «Барацьба працоўных капіталістычных краін за сваё вызваленне».

Мастакі ўзмоцнена працуюць над праектамі мастацкага афармлення горада. Цэнтральная плошча імені Леніна афармляецца на тэму «БССР — баявы непрыступны фарпост СССР на рубяжы з капіталістычным Захадам». Мастацкае пано адлюструе магутнасць Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Вуліцы будуць упрыгожаны партрэтамі кіраўнікоў партыі і ўрада, трасцарантамі.

1 і 2 мая ў клубах, парках і на стадыёнах будуць праведзены вечары самадзейнасці, народныя і маладзёжныя гулянні, бал-маскарады.

Лабарантка Боркавіцкай МТС (Дрысенскі раён, Віцебскай вобласці) комсамолка С. Ф. САВІЦКАЯ за аналізам глебаў калгаса імені Леніна, Луначарскага сельсовета.
Фото Б. А. Вернера (Фотахроніка ВЕЛТА).

ПАПЯРЭДЗІЎ КРУШЭННЕ

ВІЦЕБСК. (Кар. «Звязды»). Днямі дзяжурны па станцыі Орша-Заходняя тав. Гурын вышаў сустракаць пасажырскі поезд № 68. Аглядаючы станцыённыя пуці, ён выявіў, што ў адным месцы лопнула рэльса. Тав. Гурын неадкладна распарадзіўся перавесці поезд на другі пуць. Буйная аварыя была папярэджана.

ПЕРАДСВЯТОЧНЫ ГАНДАЛЬ

Гандлюючыя арганізацыі Менска рыхтуюцца да перадсвяточнага гандлю. Ва ўсіх промтаварных і прадуктовых магазінах час гандлю павялічваецца на дзве гадзіны. 8 прадуктовых магазінаў з 23 красавіка будуць працаваць круглыя суткі.

У магазіны сталіцы БССР завозяцца каўбасныя вырабы, капчонасцей больш 40 сартоў. Значна павялічваецца выпуск пельменяў, катлет, бітай птушкі. У хлебныя магазіны паступіць расшыраны асартымент кандзіцерскіх і хлеба-булачных вырабаў.

Гандлюючыя арганізацыі атрымалі для перадсвяточнага гандлю вагон кетавай ікры, 50 тон рыба-капчонасцей, вагон праванскага масла, 3 вагоны тушонага мяса, вялікую колькасць сухіх фруктаў і рознага варэння. У бліжэйшыя дні ў Менск з Мурманска і Ленінграда чакаецца прыбыццё парнай і марожанай рыбы —судака, лешча, траскі, розных дэлікатэсаў у масле — шпроцаў, сардзін і інш. Павялічыцца продаж масла, сыру, малочных вырабаў.

З 20 красавіка ў промтаварныя магазіны Менска паступяць для продажу абутак, гатовае адзенне, мануфактура і т. д. — на суму 10 мільённаў рублёў.

У 20 магазінах і на буйнейшых прадпрыемствах горада будуць арганізаваны сталы па прыёмцы папярэдніх заказаў на дастаўку на-дом прадуктаў.

БАЛ НАСТАЎНІКАЎ

У менскім гарадскім Доме настаўніка пачалася падрыхтоўка да першамайскіх урачыстасцей. З 15 красавіка тут будзе праведзен цыкл лекцый і дакладаў аб міжнародным становішчы і задачах па ўмацаванню абароназдольнасці нашай сацыялістычнай радзімы. Бібліятэка падрыхтавала спецыяльную літаратуру. У фае Дома арганізуецца фотавітрына лепшых настаўнікаў горада, выстаўкі работ гурткоў мастацкай вышыўкі і фаталюбіцеляў.

Узмоцнена рыхтуюцца гурткі мастацкай самадзейнасці. Самым цікавым у праграме першамайскага свята — гэта агульнагарадскі бал настаўнікаў, які адбудзецца ў Доме 1 мая. На балу выступяць артысты эстрады, будуць арганізаваны масавыя ігры, танцы, атракцыёны і т. д.

НОВЫ БУДЫНАК ПАЖАРНАЙ АХОВЫ МЕНСКА

У Менску на Краснай вуліцы паблізу трамвайнага парка пабудаван новы трохпавярховы будынак пажарнай аховы г. Менска. У ім размешчаны ўпраўленне пажарнай аховы горада, тэхнічная каманда, пажарнае дэпо, інтэрнат для байцоў, добра абсталяваны ленінскі пакой.

Тэхнічная каманда аснашчана навейшым інвентаром. Яна мае пражэктарную службу, службу сувязі, прыстасаванні для пенпага тушэння лёгкаўспламяняючыхся вадкасцей.

На будаўніцтва новага будынка пажарнай аховы затрачана 850 тысяч рублёў.

НА ГАРАДСКІЯ ТЭМЫ

БОЛЬШ КЛОПАТАЎ АБ ЧЫСТАЦЕ ГОРАДА

Пад першымі праменнямі веснавога сонца растаяў снег і адразу на многіх вуліцах, плошчах і дварах Менска выявілася карціна выключнай антысанітарыі. Зрабіце маленькую прагулку на акраінныя вуліцы — Чырвонасцяжную, Беларускую, Лодачную і інш., і вы ўбачыце там забруджаныя двары, кучы разжыжанага смецця ляжаць някранутымі. Смеццевыя ямы і пагльнаючыя калодзежы перапоўнены, не ачышчаны і бруд заліває двары.

Але не намнога лепш з чыстатой на дварах і некаторых цэнтральных вуліц горада. На многіх дварах Ленінскай, Совецкай, Рэспубліканскай — горы смецця. З двара № 8 па Комуністычнай вуліцы нечыстоты выцякаюць на маставую. У надзвычай антысанітарным становішчы двары домаўпраўленняў № 181 па Комсамольскай вул. (упраўдом т. Церашкевіч), № 133 па Садовай вуліцы (упраўдом т. Садоўскі), на Нямігскай і інш.

Як ні дзіўна, але такое агіднае антысанітарнае становішча двароў не трывожыць ні горсовет, ні райсоветы, ні органы аховы здароўя. Адзел ачысткі пры горкомгасе бяздзейнічае.

Неабходна зараз-жа ўзяцца за прывядзенне горада ва ўзорнае санітарнае становішча.

І. МІН.

СУД

ПАКЛЁПНІКІ

Жыхары вёскі Лустаселле, Глінскага сельсовета, Бягомльскага раёна, Ралавец Іван, Васюковіч Владзімір і Спірыдовіч Зміцер мелі асабістыя рахункі з Ралаўцом Васілём. Каб адпомсціць яму, яны, згаварыўшыся, паведамілі следчыя органы, што нібы Ралавец Васіль праводзіць антысовецкую агітацыю супроць мерапрыемстваў партыі і ўрада. Старшыня Глінскага сельсовета Каўбаса Іван, нават зусім не ведаючы Ралаўца Васіля, выдаў следчым органам даведку аб тым, што апошні з'яўляецца баптыстам і праводзіць антысовецкую агітацыю. Па паклёпніцкіх матэрыялах, якія былі падмацаваны даведкай сельсовета, грамадзянін Ралавец Васіль быў арыштаван.

Пры разглядзе справы ў Менскім абласным судзе паказанні «сведак» былі ўзяты пад сумненне. Справа была вернута пракурору Бягомльскага раёна для дадатковага расследвання. Дэтальнай праверкай было дакладна ўстаноўлена, што гр. Ралавец Васіль ніколі ніякай агітацыі супроць мерапрыемстваў партыі і ўрада не праводзіў і ўсе абвінавачанні супроць яго пабудаваны на глебе асабістых рахункаў. Ралавец Васіль быў вызвалены з-пад арышту, а паклёпнікі аддадзены суду.

Народны суд Бягомльскага раёна прыгаварыў паклёпнікаў: Ралаўца Івана да 3 год пазбаўлення волі з адбыццём пакарання ў аддалёных мясцовасцях СССР; Васюковіча да 2 год і Спірыдовіча да 1 года 6 месяцаў пазбаўлення волі, Каўбаса Івана да 1 года прымусова-папраўчых работ. Суд таксама рашыў спагнаць з гаспадарак асуджаных у карысць папярэпняга Ралаўца Васіля 1.000 рублёў.

Н. ЛІНІК.

Рэдакцыя газеты «Звязда» разам з Варашылаўскім РК КП(б)Б (Менск) склікае НАРАДУ ТАВАРЫШАЎ, ІНДЫВІДУАЛЬНА ВЫВУЧАЮЧЫХ ГІСТОРЫЮ ВКП(б).

Нарада адбудзецца сёння, у 7 гадзін вечара, у памяшканні рэдакцыі газеты «Звязда» (пакой № 14).

РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА». ВАРАШЫЛАЎСКІ РК КП(б)Б.

В. а. адказнага рэдактара Д. Т. ЛЕБЕДЗЕЎ.

ДЗЯРЖФІЛАРМОНІЯ БССР
клуб імені Сталіна
18 і 19 красавіка
Тамара ЦЭРЭТЭЛІ
Пачатак у 9 гадзін вечара.
Абанементы: на 18/IV — № 40, на 19/IV — № 41.
Білеты ў касе клуба з 3 да 9 г. веч. і ў магазіне санітгіены і оптыкі (рог Ленінскай і Совецкай) з 3 да 11 г. веч.

БЕЛАРУСКІ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА
15 красавіка
ЦАРСКАЯ НЯВЕСТА
Абанемент № 59.
Пачатак у 8 г. веч.

БЕЛДЗЯРЖДРАМТЭАТР
15 красавіка
ПАДЗЬ СЯРЭБРАНАЯ
Абанемент № 129.
Пачат. у 7 г. 30 м. веч.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР
15 красавіка
ГЕРШЭЛЕ ОСТРОПОЛЕР
Абанемент № 99.
Пачат. у 8 г. веч.

Кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
ЛЕНІН у 1918 годзе
Пачатак у 8, 5.30, 8 і 10.30 г. веч.

Кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ»
АЛМАЗ

Кінотэатр «СПАРТАК»
СТРАЧАНЫ РАЙ

ДЗІЦЯЧЫ КІНОТЭАТР
БАРАЦЬБА ПРАДАЎЖАЕЦЦА

Кіно «НАВІНЫ ДНЯ»
1. Журнал «Советское искусство» № 3
2. Журналы Маскоўскай студыі кінохронікі №№ 29, 30 і 31.
3. Журнал Менскай студыі кінохронікі № 19.

Кінотэатр „РОДИНА“
З 15 красавіка
НОВЫ ГУКАВЫ ФІЛЬМ
„ПУТЬ СВОБОДЕН“
Рэжысёр Е. КУЗІС — кампазітар КАЦ.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
ВЫСТУПЛЕННЕ АРТЫСТАЎ МАСКОЎСКАЙ ЭСТРАДЫ ДЭЛЬ і БОРЫ
ЮМАР, ЭКСЦЭНТРА-БУФАЧАДА.
ПАЧАТАК СЕАНСАЎ: 6, 7.30, 9.15 і 11 г. веч.
КАСА АДКРЫТА з 1 г. дня.

ПАСТАНОВАЙ НАРКАМАТА ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЙ І ЭЛЕКТРАПРАМЫСЛОВАСЦІ
на базе менскай канторы Снабцяжпрома
(БЫЎШАЯ РАЙТЭХКАНТОРА)
АРГАНІЗАВАНА
Беларуская кантора „СНАБЭЛЕКТРОПРОМ“
ПА ЗАГАТОЎЦЫ І СНАБЖЭННЮ ТАВАРАМІ І МАТЭРЫЯЛАМІ БУДОЎЛЯЎ І ПРАДПРЫЕМСТВАЎ НАРКАМАТА ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЙ І ЭЛЕКТРАПРАМЫСЛОВАСЦІ.
АДРАС КАНТОРЫ: г. Менск, Комсамольская 8. Тэл. 22-905 і 23-806.

СССР - НАРКАМХАРЧПРОМ - БССР — ТРЭСТ БЕЛМАСЛАКРАХМАЛ г. Менск, пл. Свабоды, 21/1.
Не трацце часу на прыгатаванне салодкага блюда
Купляйце гатовыя сухія кісялі
Кісялі выпускаюцца: клюквены, яблочны, вішнёвы, апельсінавы, рабінавы і інш.
На натуральных экстрактах, з лепшых сартоў крахмала.
Смачна, танна, пажыўна! Кісялі маюць віталіны
Патрабуйце сухія кісялі, якія выпускае Магілеўскі сушкамбінат ва ўсіх прадуктовых і гастранамічных магазінах.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ФІЛАРМОНІЯ БССР
ЭСТРАДНЫ СЕКТАР Дзяржфілармоніі БССР
ПРЫМАЕ ЗАЯЎКІ НА АБСЛУГОЎВАННЕ ВЕЧАРОЎ,
ПРЫСВЕЧАНЫХ
СВЯТКАВАННЮ ПЕРШАГА МАЯ
СІЛАМІ КАЛЕКТЫВАЎ ФІЛАРМОНІІ, САЛІСТАМІ БЕЛДЗЯРЖТЭАТРА ОПЕРЫ І БАЛЕТА, КАНСЕРВАТОРЫІ, а таксама СІЛАМІ ЗАПРОШАНЫХ АРТЫСТАЎ ЭСТРАДЫ МАСКВЫ, ЛЕНІНГРАДА, КІЕВА, БАКУ і інш. гарадоў.
Заяўкі прымаюцца да 20 красавіка ў эстрадным сектары Дзяржфілармоніі БССР — Менск, вул. Урыцкага, 21. тэл. 24-625, 22-755.
Па выкліку арганізацыі высылаецца ўпаўнаважаны.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Упраўленне сяцей і падстанцый г. Менска
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І ЎСТАНОЎ, што
ЗАЯЎКІ НА ІЛЮМІНАЦЫЙНЫЯ УСТАНОЎКІ
ДА ПЕРШАМАЙСКІХ СВЯТ
павінны быць паданы не пазней 20 красавіка.
Пасля ўказанага тэрміну ніякія заяўкі прымацца не будуць.
У заяўках павінна быць указана:
1. ДАКЛАДНЫ АДРАС ЭЛЕКТРАЎСТАНОЎКІ.
2. ПАТРАБУЕМАЯ МАГУТНАСЦЬ У КВТ.
3. ПРОЗВІШЧА І ПАСАДА АДКАЗНАЙ АСОБЫ ЗА ЎСТАНОЎКУ.
ІЛЮМІНАЦЫЙНАЯ ЎСТАНОЎКА ПАВІННА БЫЦЬ ЗРОБЛЕНА ВЫКЛЮЧНА ЛЯМПАМІ Ў ПАТРОНАХ.
Усе далучаныя без дазволу УСП электраўстаноўкі будуць разглядацца як самавольна ўключаныя і будуць адключаны.
ЗАЯЎКІ падаваць па адрасу: Совецкая 126 —абанементнаму аддзелу ўпраўлення сяцей і падстанцый г. Менска.
АДМІНІСТРАЦЫЯ.

ДА ЎВАГІ
Калгасаў, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў!
загатаўляйце
іўавую, лазовую і яловую **кару**, ліпавы луб і бярэсту
для скурана-абутковай прамысловасці.
ЗДЗІРКУ ЛАЗОВАЙ КАРЫ рабіце толькі з ссечанага хлыста, убірайце хлысты па ўказанню лясніка, каб захоўваць зараслі і не засмечваць лес.
ЯЛОВУЮ КАРУ ЗДЗІРАЙЦЕ з ссечанай яловай драўніны на лесаўчастках, калгасных, школьных і іншых будаўніцтвах.
Сушыце кару паветранай сушкай, лепш за ўсё пад навесам, а не на сонцапёку. Захоўвайце знятую кару ад дажджу, каб уникнуць пагоршання якасці кары.
ЗДАВАЙЦЕ КАРУ НА СКЛАДЫ РАЙЗАГАЎ І СЕЛЬПО СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЕРАЦЫІ, а таксама ЗАГОТПУНКТАМ БЕЛСКУРСНАБЗБЫТА, у любых колькасцях.
У 1939 ГОДЗЕ ЦАНА НА ІЎАВУЮ КАРУ ПАВЫШАНА і ўстаноўлена ў 240 рублёў за тону сухой кары.
ЦАНА ЗА ТОНУ ЯЛОВАЙ КАРЫ ўстаноўлена ў 80 рублёў за тону.
ДОБРАЯ КАРА, ЛУБ І БЯРЭСТА — матэрыял для выпрацоўкі высокаякаснага абутку і інш. скураных вырабаў.
ЧАС ЗДЗІРКІ КАРЫ — ў перыяд руху соку, з 15 мая па 15 ліпеня. Лесарубачныя білеты можна атрымаць бясплатна ў лясніцтвах або ў райлесгасе. БЕЛСКУРСНАБЗБЫТ.

МЕНУНІВЕРМАГУ
(Совецкая 43)
патрабуюцца
ШОФЕРЫ для ЗІС-5 і ГАЗ-АА і БУХГАЛТАРЫ-КАРТАТЭТЧЫКІ для работы на складах.
Звяртацца ў аддзел кадраў Менунівермага — 3-ці паверх.

РАСКРОЙНАЙ ТАВАРНАЙ БАЗЕ
САЮЗЗАГОТСКУР
патрабуецца
заг. складам.
ЗВЯРТАЦЦА ДА ДЫРЭКТАРА БАЗЫ — Комсамольская, 5.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая, 49. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдактара — 21-352; намесніка рэдактара — 25-188; сакратарыята — 21-846. Аддзелаў: партыйнага — 21-353; совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412; прамысловага — 21-356; сельскагаспадарчага — 20-830; літаратуры, мастацтва, навукі і асветы — 23-955; мясцовай і замежнай інфармацыі — 25-180; пісем — 20-844, 21-390, 21-885; ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры — 21-356; заг. выдавецтвам — 21-358; абʼяў — 21-845.

Уп. Галоўлітбела № К—1028. Менск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. М., Л., Ш. 8